Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 114 (29483)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЯК СУПРАЦЬСТАЯЦЬ СУЧАСНЫМ ВЫКЛІКАМ? 5

МІНСК У ЧЭРВЕНІ 1941-ГА 20–21

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Дзяржава працягне інвеставаць у аднаўленне сваіх гісторыка-культурных славутасцяў. Трэба развіваць унутраны турызм. Заморскія паездкі, вядома, добра, але ўсё роўна большую частку часу беларусы адпачываюць дома. Каб было куды ездзіць, трэба ўкладваць у інфраструктуру турызму, у тым ліку ў аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны. На жаль, практычна ўсё, што было створана ў Беларусі за многія стагоддзі і пакаленні, аказалася разбуранае з прычыны розных гістарычных падзей, галоўным чынам ваенных. Таму дзяржава інвеставала і будзе ўкладваць і далей значныя грошы ў аднаўленне тых нешматлікіх уцалелых аб'ектаў».

Цаглінка да цаглінкі — будзе школа

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Гомель, мікрараён Хутар, будаўніцтва школы, якую плануюць адкрыць да пачатку новага навучальнага года. Сярод будаўнічых арганізацый абласнога горада на аб'екце, які ўзводзіцца, працуе брыгада муляраў Аляксандра ГУРКОВА ПМК-16 Гомельскага аб'яднанага будаўнічага трэста.

КАРАТКА

- **БелАЗ адгрузіў чатыры 45-тонныя кар'ерныя самазвалы ў Македонію.**
- У Новай Гуце з 1 ліпеня пачнецца эксперымент па дэзынфекцыі транспарту.
- **Уладзімір Вашчанка абраны старшынёй Беларускай федэрацыі валейбола.**
- У Бабруйску прыпынена дзейнасць шасці прыватных аптэк.
- **У краіне павялічаны нормы расходаў на харчаванне ва ўстановах адукацыі.**
- Адобраны пераклад Воднага кодэкса на беларускую мову.

Героі побач

Лісты медсястры

Гісторыя гэтай сціплай жанчыны з Хойнікаў для мне стала своеасаблівай сучаснай рэінкарнацыяй гераіні са старонак рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні». Нагадаю: у знакамітым творы медсястра Клаўдзія Сухадол дапамагала доктару Савічу хаваць і лячыць партызан у гомельскім нямецкім шпіталі ў вайну, а пра яе подзвіг мала хто ведаў.

Аб гісторыі медыцынскай сястры Марыны ТАРАСАВЕЦ з Хойнікаў таксама можна напісаць кнігу ці зняць фільм. Толькі тры месяцы таму, праз 36 гадоў пасля яе вяртання з самай доўгай і смяротна небяспечнай камандзіроўкі, аб грамадзянскім подзвігу Марыны Рыгораўны даведаліся жыхары Гомельшчыны. Яна стала «Жанчынай года — 2020» па выніках конкурсу ў Гомельскай вобласці, пераможцай у намінацыі «Жаночая доблесць».

СТАР. 4

Ручнікі над Дняпром

Сімвалам рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») абраны беларускі ручнік. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.

«У гэтым годзе складваецца шматгранная для ўсіх узростаў, аматараў рознага віду народнай творчасці праграма. Асноўным сімвалам свята сёлета стаў ручнік — тое, што суправаджае славянскага чалавека ад нараджэння да смерці, што сустракаецца ва ўсіх нашых культурных мерапрыемствах, святах. Такі сімвал дазволіць у поўнай меры раскрыць самабытную культуру беларускага народа, паказаць адзінства славянскай культуры. З аднаго боку, ручнік аб'ядноўвае ўсіх нас, а з іншага — паказвае індывідуальныя асаблівасці кожнага з рэгіёнаў краіны», — адзначыў Валерый Малашка.

Сёлета з улікам эпідсітуацыі фестываль будзе адзін дзень — 10 ліпеня. Традыцыйна — на беразе ракі Днепр у аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна, паведамляе БелТА.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

Нацыянальная бяспека і рэспубліканскі бюджэт

У Палаце прадстаўнікоў прайшло чарговае пасяджэнне пятай сесіі

СТАБІЛЬНАСЦЬ КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ...

Дэпутаты прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аховы суверэнітэту і канстытуцыйнага строю», які прадставіў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ.** Новым дакументам уносяцца змены ў законы аб надзвычайным становішчы, ваенным становішчы і Узброеных Сілах. Міністр заўважыў, што перад прапанаваннем навел прааналізаваны падзеі ў 2020 годзе ў нашай краіне і СНД.

«Мы прааналізавалі, як бы мы дзейнічалі ў той сітуацыі, калі б нам прайшлося ўводзіць надзвычайнае або ваеннае становішча. З улікам гэтага аналізу ёсць неабходнасць карэкціроўкі дадзеных законапраектаў. Таму я лічу, што законапраект вельмі своечасовы, накіраваны на папярэджанне масавых беспарадкаў. Але ў першую чаргу ён накіраваны на прафілактыку, недапушчэнне, нейтралізацыю пагроз і выклікаў, якія паступаюць у адрас нашай рэспублікі», — сказаў Іван Кубракоў.

Законам уводзіцца новы каардынацыйны орган у надзвычайнай сітуацыі — Савет бяспекі. Ён будзе кантраляваць работу ўсіх службаў, у тым ліку і сілавога блока пры ўвядзенні надзвычайнага становішча.

«Надзвычайнае або ваеннае становішча будзе ўводзіцца ў тым выпадку, калі вырашыць пэўныя пытанні па навядзенні парадку і ўстараненні праблем іншым чынам немагчыма. Неабходны будуць нейкія іншыя дадатковыя абмежавальныя меры», — дадаў кіраўнік МУС.

Па яго словах, людзям няма прычыны турбавацца, бо ўсе меры накіраваны на іх бяспеку.

«Мы яе (бяспеку. — **«Зв.»**) забяспечым у любым выпадку, таму сёння і прымаем гэты закон і ўносім прапановы, каб у будучыні не прыйшлося ўводзіць ні ваеннае, ні надзвычайнае становішча, а мы своечасова рэагавалі і не дапускалі такіх сітуацый у нашай краіне», — рэзюмаваў Іван Кубракоў.

Як дадаў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Яўген ЗАЙЦАЎ,** законапраект пашырае паўнамоцтвы Савета бяспекі і карэлюецца з Дэкрэтам Прэзідэнта № 2 па ахове суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу.

«Наша дзяржава сацыяльная, і павялічваць колькасць супрацоўнікаў МУС, МНС няма неабходнасці. За кошт перараз мяркавання сіл, надання ім дадатковых функцый мы будзем выконваць задачы, што датычаць аховы суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу», — падкрэсліў Яўген Зайцаў.

Закон стаў неабходны менавіта сёння, як адзначыў дэпутат, бо змяняецца абстаноўка ўнутры краіны, па-за яе межамі — час патрабуе быць гатовымі адэкватна рэагаваць на выклікі нацыянальнай бяспецы.

...І ФІНАНСАВАЯ

У адным чытанні Палата прадстаўнікоў зацвердзіла праекты законаў «Аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай аховы насельніцтва Рэспублікі Беларусь за 2020 год» і «Аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2020 год».

> Нагадаем, што леташні бюджэт быў сфарміраваны з дэфіцытам амаль у 1 мільярд рублёў, а яго выкананне ў пачатку года ажыццяўлялася ва ўмовах пагаршэння работы нафта-хімічнага комплексу і прыпынення эканамічнай актыўнасці з-за кавіду. У выніку рэалізацыі бюджэту ўдакладнены план па даходах склаў 23,4 мільярда рублёў, па расходах — 26,4 мільярда рублёў з дэфіцытам у 3 мільярды рублёў. За 2020 год паступіла даходаў на суму 23,6 мільёна рублёў.

Выступаючы з дакладам, **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО** паведаміў, што сёлетні рэспубліканскі бюджэт па выніках пяці месяцаў выконваецца нядрэнна. Гэтаму садзейнічае аднаўленне эканомікі, якое, дзякуючы знешняй кан'юнктуры, ідзе апераджальнымі тэмпамі.

«Па папярэдніх выніках за пяць месяцаў назіраецца рост ВУП у тры працэнты. Зразумела, гэта аказвае ўплыў і на фарміраванне даходнай часткі бюджэту. За студзень — май 2021 года даходы склалі 10,8 мільярда рублёў — гэта 45,7 працэнта ўдакладненага гадавога плана і 91,6 працэнта плана першага паўгоддзя», — канстатуе першы намеснік міністра.

Па яго звестках, апераджальнымі тэмпамі ідуць паступленні па падатку на дабаўленую вартасць, па падатку за здабычу калійнай солі, па ўвозных мытных пошлінах на калійныя ўгнаенні, нафту і нафтапрадукты.

Належна выконваюцца і мясцовыя бюджэты, у першую чаргу дзякуючы паступленню падаходнага падатку заработнай платы. «Сёння прафіцыт мясцовых бюджэтаў, калі не памыляюся, складае каля 800 мільёнаў рублёў», — заўважыў Дзмітрый Кійко.

Наконт дзяржаўнага доўгу ён сказаў, што значную частку ў структуры складаюць звязаныя пазычанні на будаўніцтва АЭС. «Таму мы ацэньваем сітуацыю як цалкам кіруемую, — запэўнівае першы намеснік міністра фінансаў. — У нас ёсць канкрэтны план па прыцягненні крэдытаў на гэты год. І ён ужо на 70 працэнтаў выкананы. У канцы мая — пачатку чэрвеня прыйшоў чарговы транш у памеры 500 мільёнаў долараў ад Расійскай Федэрацыі. Ёсць планы па прыцягненні каля 200 мільёнаў долараў на ўнутраным рынку і выхад на рынак аблігацый Расійскай Федэрацыі. Таму бягучы год мы ўжо поўнасцю закрываем па абслугоўванні і пагашэнні дзяржаўнага доўгу».

У другім чытанні дэпутаты разглядалі праекты законаў «Аб узносах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай аховы насельніцтва», «Аб змяненні законаў па пытаннях судова-экспертнай дзейнасці», «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту».

* * *

Перад пасяджэннем сесіі **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Людміла МАКАРЫНА-КІБАК і намеснік старшыні гэтай камісіі Валянціна КУРСЕВІЧ** правялі брыфінг для прадстаўнікоў СМІ. Тэмай яго стаў праект закона аб донарстве крыві і яе кампанентаў. Дэпутаты патлумачылі палажэнні для таго, каб прадухіліць фэйкавыя звесткі і перакручванне навацый.

Людміла Макарына-Кібак падкрэсліла, што асноўная навацыя закона — тое, што донару даецца права выбару здаваць кроў бязвыплатна ці платна. «Але асноўная канцэпцыя — ссоўванне акцэнту на карысць бязвыплатнага донарства. Колькасць пацыентаў, якія становяцца бязвыплатнымі донарамі ці пераходзяць з катэгорыі платных донараў у бязвыплатныя, з году ў год павялічваецца. І сёння недахопу крыві ў Рэспубліцы Беларусь няма», — паведаміла дэпутат.

Пераход на бязвыплатнае донарства — сусветны трэнд, прапанаваны Мельнбургскай канвенцыяй. Згодна з яе палажэннямі, да 2020 года ўсе краіны павінны былі паступова перайсці на бясплатнае донарства.

Як дадала Валянціна Курсевіч, законам устанаўліваюцца дадатковыя гарантыі для бясплатных донараў. Гэта пакрыццё расходаў, звязаных з выкананнем донарскай функцыі, наданне дапамогі па часовай непрацаздольнасці з першага дня страты ў памеры 100 %, узнагарода знакам «Ганаровы донар».

«А той катэгорыі грамадзян, хто мае гэты знак, прадугледжваюцца яшчэ дадатковыя льготы. Гэта павышэнне пенсіі па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту ў адпаведнасці з заканадаўствам (да 40 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце), скідка 25 працэнтаў на платныя медыцынскія паслугі, якія аказваюцца ў дзяржаўных установах аховы здароўя, прадастаўленне на працягу каляндарнага года кароткатэрміновага адпачынку без захавання заработнай платы працягласцю да 14 дзён і штогадовая грашовая выплата ў памеры трох базавых велічынь і іншыя», — расказала Валянціна Курсевіч.

Для таго каб стаць ганаровым донарам, неабходна зрабіць 40 данацый крыві і 80 данацый кампанентаў крыві.

Закон вынесуць на першае чытанне на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў.

Марыя ДАДАЛКА.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«Дзякуй расійскім калегам за паслядоўную і ўзважаную пазіцыю»

Юбілейная, 60-я, сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі прайшла ўчора ў фармаце відэаканферэнцсувязі. Удзельнікі абмеркавалі пытанні перспектыўнага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, выкананне бюджэту бягучага года і яго фарміравання на 2022 год. Вялікая ўвага аддадзена пытанням фарміравання саюзных праграм і стварэнню мадэльнага заканадаўства Саюзнай дзяржавы. Не абышлі ўвагай і пытанне абароны інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы, традыцыйных каштоўнасцяў нашых народаў, маладзёжнай палітыкі.

Як адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** сёння, на жаль, у міжнародных адносінах па-ранейшаму дамінуюць палітыка нацыянальнага эгаізму, імкненне да сілавога прасоўвання геапалітычных інтарэсаў асобных краін.

— І Беларусь зноў, як у далёкім 1941 годзе, прымае на сябе ўдар. Гэтым разам так званага калектыўнага Захаду, нацэленага на падрыў суверэнітэту і незалежнасці краіны, разбурэнне эканомікі, а ў канчатковым выніку — развал Саюзнай дзяржавы, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Хачу падзякаваць нашым расійскім калегам за паслядоўную і ўзважаную пазіцыю, палітычную і інфармацыйную падтрымку на фоне знешняга ціску на беларускае кіраўніцтва і спроб дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне.

Ён адзначыў нядаўнія станоўчыя моманты ў беларуска-расійскіх узаемаадносінах:

— У першым квартале гэтага года тавараабарот вырас на 20. Такая дынаміка дае ўсе падставы меркаваць, што да канца года мы выйдзем на дакрызісны ўзровень 2019 года. Важкім укладам у ажыўленне эканомікі стала барацьба з каранавіруснай інфекцыяй. Мы ўдзячныя Расіі за аказаную дапамогу і арганізацыю вытворчасці вакцыны «Спадарожнік V», гэта рашэнне высока ацанілі беларусы. Паступова знімаюцца абмежаванні на беларуска-расійскай граніцы, аднаўляюцца рэгулярныя адносіны. Грамадзянамі запатрабаваны паслугі хуткаснага цягніка «Ластачка», новых авіярэйсаў у рэгіёны Расіі. Мяркую, што лагічным працягам гэтай работы павінны стаць найхутчэйшая адмена ўсіх абмежаванняў па перасоўванні праз граніцу і поўнае аднаўленне ўсіх відаў транспартных стасункаў. Нам неабходна падумаць над пашырэннем геаграфіі маршрутаў, павелічэннем колькасці рэйсаў у авія- і чыгуначных стасунках. Гэта важна і для далейшага ўмацавання міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, якое было і застаецца залогам поспеху саюзнага будаўніцтва.

Пракаментаваў Уладзімір Андрэйчанка і рэалізацыю саюзных праграм:

— Апошнія гады, на жаль, намецілася тэндэнцыя скарачэння саюзных праграм і іх недафінансаванне. Будзем прама казаць: гэтыя праграмы часам няякасна рыхтуюцца і, акрамя таго, з вялікімі затрымкамі па ўзгадненні. Мы дамовіліся паскорыць гэтыя працэсы і ўнесці змены ў пэўныя заканадаўчыя акты, каб змяніць працэс узгаднення нашых праграм.

Спікер падкрэсліў, што саюзныя праграмы мусяць насіць стратэгічны характар, каб у іх межах выраблялася высокатэхналагічная прадукцыя з высокай дабаўленай вартасцю, якая будзе запатрабавана на сусветных рынках.

Таксама было абмеркавана пытанне, якое наўпрост датычыцца грамадзян Беларусі і Расіі — распаўсюджанне дзеяння страхавых полісаў транспартных сродкаў Расіі і Беларусі на ўсю тэрыторыю Саюзнай дзяржавы. Гэта аблегчыць расіянам і беларусам паездкі ў суседнія краіны.

— Беларусы, калі ўязджаюць на тэрыторыю Расіі, афармляюць такі страхавы поліс на пяць дзён, расіяне — на пятнаццаць. Гэта першы крок, дзе нарматыўныя дакументы трэба наблізіць. І далей ёсць над чым папрацаваць кампетэнтным органам. Перш за ўсё, мы хочам выдаць мадэльны закон, у адпаведнасці з якім можна будзе пасля ўнесці змены ў заканадаўства Беларусі і Расіі. Гэта сур'ёзнае пытанне, і, мяркую, яно будзе вітацца нашымі грамадзянамі.

Алена КРАВЕЦ.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? БУДУЦЬ АДКАЗЫ!

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 19 чэрвеня, **з 9.00 да 12.00,** правядуць:

- старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44

Актуальна

БУДОЎЛЯ ДАРАЖЭЕ

Прычыны росту цэн на будматэрыялы і магчымыя варыянты стабілізацыі сітуацыі абмеркавалі прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Нагадаем, што маніторынг цэн ФПБ робіць пастаянна, каб мець аператыўную інфармацыю аб цэнавай даступнасці насельніцтву найважнейшых тавараў і паслуг. Пры гэтым у нацыянальным прафцэнтры дзейнічае таксама гарачая лінія па пытаннях цэн і тарыфаў. Звароты грамадзян, звязаныя з праблемай росту цэн, становяцца асновай для правядзення дадатковага аналізу па тых ці іншых пазіцыях, акцэнтавалі ўвагу ў прэс-службе ФПБ.

— У апошні месяц да нас паступіла досыць шмат зваротаў з прычыны значнага росту цэн на розныя будматэрыялы, — адзначыла **Алена МАНКЕВІЧ, намеснік старшыні ФПБ.** — Мы правялі выбарачны маніторынг сітуацыі ў гэтай сферы. Аналізаваліся рознічныя цэны ў 49 гандлёвых пунктах у розных рэгіёнах краіны. Па выніку гэтага маніторынгу мы фіксуем факты значнага росту цэн для спажыўцоў на піламатэрыялы, вырабы з металу, аздобныя матэрыялы, шыфер, будаўнічыя дэталі і канструкцыі з дрэва і іншыя тавары. Так, напрыклад, у сёлетнім чэрвені ў параўнанні са снежнем мінулага ў некаторых крамах Віцебскага рэгіёна назіраўся рост цэн на піламатэрыялы больш чым у два разы. Цэмент у асобных пунктах стаў даражэйшы на 20 %, вырабы з металу — на 80 %.

Дадатковае вывучэнне сітуацыі паказала, што шмат у чым гэтая сітуацыя тлумачыцца ростам сусветных цэн. Так, на сусветным рынку значна павысілася цана металу. Звязана гэта шмат у чым з недастатковай прапановай тавараў, паколькі многія замежныя прадпрыемствы летась у сувязі з пандэміяй спынялі сваю дзейнасць.

Што датычыцца піламатэрыялаў, цэны на якія ў нашай краіне за мінулыя паўгода павысіліся найбольш значна, то гэтая сітуацыя таксама шмат у чым абумоўлена сусветнымі тэндэнцыямі. Напрыклад, у Канадзе, ЗША, Польшчы, Літве цана піламатэрыялаў павысілася ў два разы.

Разам з тым, як было адзначана падчас абмеркавання гэтага пытання прадстаўнікамі ФПБ, МАРГ і КДК, шмат у чым на цану піламатэрыялаў у краіне паўплывала і павелічэнне попыту на ўнутраным рынку ў сувязі з уводам у эксплуатацыю буйных прамысловых перапрацоўчых аб'ектаў.

Ёсць пытанні і з прычыны абгрунтаванасці і аб'ектыўнасці адпускных цэн і гандлёвых надбавак у асобных гандлёвых пунктах. Таксама патрабуе вывучэння і пытанне, чаму ў рэгіёнах цэны на аналагічныя тавары значна адрозніваюцца.

— Федэрацыя прафсаюзаў занепакоена становішчам у гэтай сферы, паколькі рост цэн на будаўнічыя матэрыялы ў выніку непазбежна прывядзе да павелічэння цэн на жыллё, мэблю, іншыя тавары. Гэта ў сваю чаргу будзе садзейнічаць раскрутцы інфляцыі, аказваць ціск на ўстойлівасць беларускага рубля, што адмоўна адаб'ецца на пакупніцкай здольнасці насельніцтва. Акрамя таго, рост цэн на матэрыялы адмоўна адбіваецца ў цэлым на дзейнасці будаўнічых арганізацый: значна павышаюцца іх выдаткі, зніжаецца прыбытак, а значыць, і заробак работнікаў, — адзначыла Алена Манкевіч. — У сувязі з гэтым мы лічым, што сёння зацікаўленыя ведамствы павінны правесці комплексную работу па стабілізацыі сітуацыі ў гэтай сферы.

Паводле інфармацыі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, пэўныя крокі ў гэтым пытанні ўжо зроблены. У першую чаргу гаворка ідзе аб мерах, накіраваных на ахову і насычэнне неабходнай прадукцыяй унутранага рынку. Дзейнасць у гэтым кірунку працягнецца і надалей. Акрамя таго, бакі дамовіліся дэталёва вывучыць усе факты значнага росту цэн у гандлёвых пунктах, зафіксаваныя прафсаюзамі, для прыняцця пры неабходнасці адпаведных мер рэагавання.

Надвор'е

У гэтыя «дні тушканчыка» лепш хавацца ў норах

Кліматычныя рэкорды будуць пабіты і ў чэрвені? Што, плюс 34 не мяжа?

Яшчэ далёка не сярэдзіна лета, а сонца ўжо вырашыла нас расплавіць. У нашу краіну, як заўсёды, раптам, занесла суперспякотнае надвор'е. Неймавернае цяпло распаўсюдзіцца па тэрыторыі Беларусі не толькі ў выхадныя, спякота будзе нарастаць і на наступным тыдні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А ўсё таму, што антыцыклон Зое прынёс на тэрыторыю нашай краіны цёплае, сонечнае надвор'е. Ён прастаіць у нас да канца тыдня, таму дажджоў не чакаецца наогул, а спякота будзе толькі нарастаць. У сувязі з гэтым эксперты раяць успомніць асноўныя правілы паводзін у спякоту: не выходзіць без асаблівай патрэбы на вуліцу падчас максімальнай сонечнай актыўнасці, а калі ўсё ж выйшлі, не забывайце пра галаўны ўбор і абавязкова вазьміце бутэлечку з вадой. На вуліцы лепш трымацца ў цені і перыядычна заходзіць у грамадскія памяшканні з кандыцыянерамі.

Сёння, як, зрэшты, і ў суботу, нядзелю і панядзелак, ападкаў не чакаецца. Неба будзе абсалютна чыстым. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра ў пятніцу складзе 25—31 цяпла. Так, цяпла, а далей будзе час спёкі.

Умераны паўночна-заходні вецер прагназуецца і ў суботу. Пачне павышацца тэмпература паветра ўжо ўначы, калі чакаецца ад плюс 11 градусаў да 16 цяпла. Удзень стане прыпякаць як у ліпені — ад плюс 27 да плюс 32 градусаў.

У нядзелю і панядзелак грамадзяне нашай краіны, асабліва гараджане, будуць праходзіць выпрабаванне супердушным надвор'ем. Дажджоў не будзе, а вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ўжо 13—18 градусаў вышэй за нуль, удзень — ад плюс 28 градусаў да 33 цяпла. Падобна, на гэтым абсалютныя сонечныя дні ў нас скончацца, але спякота не знікне.

У аўторак будзе пераважна без ападкаў, але ўдзень у асобных раёнах па заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—20 цяпла, удзень — усё тыя ж плюс 28—33 градусы. Выключна ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў сераду. Уначы ў гэты дзень тыдня ў нас будзе надзвычай цёпла, калі тэмпература паветра не апусціцца ніжэй 15—22 цяпла. Удзень нам таксама будзе не салодка: максімальная тэмпература паветра ад плюс 28 градусаў да 34 цяпла.

Спецыялісты Белгідрамета паведамляюць, што тэмпература вады ў рэках і вадаёмах нашай краіны складае плюс 18—23 градусы. Сіноптыкі рэкамендуюць быць уважлівымі і асцярожнымі падчас адпачынку каля вадаёмаў. Акрамя таго, у сувязі з цёплым і сухім надвор'ем павялічваецца і клас пажаранебяспекі. Таму, адпраўляючыся ў лес, не варта выкідваць у траву недакуркі і падпаленыя запалкі.

Сяргей КУРКАЧ.

Спадчына

НОВЫЯ ЗГАДКІ ПРА КУПАЛУ

Пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ў Выдавецкім доме «Звязда» працягваецца рэалізацыя кніжнага праекта па праграме «Беларусы ў свеце»

Запланаваны выпуск кнігі Льва Клейнбарта, вядомага крытыка, публіцыста, журналіста, які нарадзіўся ў Капылі ў 1875 годзе, доўгі час жыў і працаваў у Петраградзе — Ленінградзе. Наш зямляк займаўся вывучэннем гісторыі рускай літаратуры, спрыяў развіццю беларуска-рускіх літаратурных стасункаў. Леў Клейнбарт з'яўляецца аўтарам успамінаў «Сустрэчы. Янка Купала». Выданне гэтай працы і іншых даследаванняў Льва Клейнбарта прымеркавана да Дня беларускага пісьменства ў Капылі, які адбудзецца на пачатку верасня 2021 года, і да 140-годдзя з дня нараджэння народнага песняра Беларусі Янкі Купалы.

У выданні згадваецца вялікая колькасць асоб — пісьменнікаў, дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння, культуры, простых людзей, якія ўнеслі ўклад у аўтарытэтны імідж Беларусі, беларускай літаратуры ў Расіі. Кніга дазваляе паглыбіцца ў рэалії паўсядзённага жыцця Янкі Купалы, больш дасканала зразумець філасофію яго творчасці.

На старонках успамінаў чытач сустрэнецца і з лёсамі Браніслава Эпімах-Шыпілы, Сяргея Палуяна, Ядвігіна Ш., Уладзіміра Самойлы, Якуба Коласа, ды шмат каго іншага, хто спрыяў фарміраванню асобы Янкі Купалы, яго творчых і жыццёвых перакананняў. Выданне рыхтуецца да выхаду ў свет сумесна з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы.

Сяргей ШЫЧКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Японія з 20 чэрвеня адменіць надзвычайнае становішча

Надзвычайнае становішча, якое дзейнічала ў Японіі ў сувязі з пандэміяй каранавіруса COVID-19, адменяць у Токіа і некалькіх іншых густанаселеных рэгіёнах. Аб гэтым паведамілі мясцовыя СМІ са спасылкай на заяву японскага прэм'ера Есіхідэ Сугу. «З сярэдзіны мая колькасць заражэнняў у краіне знізілася, паляпшаецца сітуацыя з бальнічнымі ложкамі. З іншага боку, у некаторых рэгіёнах назіраюцца прыкметы таго, што знізіліся колькасці заражэнняў запавольваецца», — заявіў Суга падчас прэс-канферэнцыі. Разам з тым ён абвясціў, што замест надзвычайнага становішча ў сілу ўступіць шэраг абмежавальных мер у Токіа і ў некаторых іншых рэгіёнах краіны. Гэтыя абмежаванні датычацца продажу алкаголю, а таксама гадзін работы бараў і рэстаранаў, і будуць дзейнічаць да 11 ліпеня. Надзвычайнае становішча працягне дзейнічаць толькі ў прэфектуры Акінава. Як вядома, цырымонія адкрыцця Алімпійскіх гульняў адбудзецца 23 ліпеня. Спаборніцтвы будуць праводзіцца да 8 жніўня. Ці змогуць заўзятары наведаць алімпійскія мерапрыемствы і ў якім аб'ёме будуць запоўнены стадыёны, пакуль невядома. Чакаецца, што пра гэта будзе аб'яўлена бліжэй да канца месяца.

У Германіі паўсотні паліцэйскіх знаходзілася ў праваэкстрэмісцкіх чатах

Апошнія датычыцца супрацоўнікаў паліцыі федэральнай зямлі Гесэн, заявіў міністр унутраных спраў гэтай федэральнай зямлі Петэр Бойт, паведаміла Deutsche Welle. Паводле яго даных, у праваэкстрэмісцкіх чатах знаходзіліся супрацоўнікі паліцэйскага спецназа (SEK), зямельнага ведамства па крымінальных справах (LKA), дзяжурных атрадаў, кіравання федэральнай паліцыі, а таксама яго падраздзяленняў ва ўсходнім і паўднёвым Гесэне. Па словах Петэра Бойта, па гэтай справе былі праведзены праверкі, працягваецца экспертыза канфіскаваных матэрыялаў. Пра тое, што ў Германіі павялічваецца колькасць прыхільнікаў правага экстрэмізму, раней паведамлялася ў дакладзе нямецкага Федэральнага ведамства па ахове Канстытуцыі. У 2020 годзе яна дасягнула 33 тысяч чалавек. Паводле ацэнак спецслужбаў ФРГ, амаль 40 працэнтаў з іх схільныя да гвалту або падтрымліваюць яго.

Кітайскі касмічны карабель сустыкаваўся з арбітальнай станцыяй

«Шэньчжоў-12» з трыма касманаўтамі на борце пасляхова сустыкаваўся на арбіце з кітайскай арбітальнай станцыяй «Цяньгун». Аб гэтым паведамілі ў Кітайскай праграме пілатуемых палётаў. Карабель быў выведзены на арбіту ракетай-носьбітам «Чанчжэн-2F», якая стартавала з касмадрома «Цзюцюаань». У склад экіпажа ўваходзяць Не Хайшэн, Тан Хунбо, што пабывалі ўжо ў космасе, а таксама Лю Бамін, для якога гэты палёт стаў першым. Стан экіпажа ацэньваецца як добры, запуск ажыццёўлены паспяхова, адзначаецца ў паведамленні Кітайскай праграмы пілатуемых палётаў. Пасля стыкоўкі з базавым модулем будучай станцыі, які быў запушчаны ў красавіку, задачай касманаўтаў будзе зборка і падключэнне абсталявання, якое дастаўляецца на модуль грузавымі караблямі. Для завяршэння будаўніцтва станцыі спатрэбіцца 11 запускаў і крыху больш за год. Плануецца, што на арбіту выведуць два лабараторныя модулі, якія будуць прыстыкаваныя да базавага, запушчаны чатыры грузавыя і чатыры пілатуемыя караблі. Агульная вага станцыі пасля завяршэння яе будаўніцтва складзе каля 100 тон.

«УЗНАГАРОДА ПАВІННА ІХ ЗНАЙСЦІ»

Медыкі пачалі прафесійнае свята экскурсіяй у Палац Незалежнасці

Дзень медыцынскага работніка, які сёлета адзначаецца 20 чэрвеня, пачаўся раней — экскурсіяй у Палац Незалежнасці. Больш за 100 прадстаўнікоў медыцынскай сферы наведалі рэзідэнцыю Прэзідэнта.

Фота БелТА.

Разам з калегамі ўдзел у экскурсіі прыняў і **міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** Ён падкрэсліў, што для многіх медыкаў свята праходзіць на рабочых месцах, вялікая іх колькасць без перапынку аказвае дапамогу пацыентам.

«Прыемна, што напярэдадні свята многія прадстаўнікі галіны наведалі Палац Незалежнасці, у тым ліку прадстаўленыя да ўзнагарод на ўрадавым узроўні. Гэтая экскурсія дазволіла далучыцца да гісторыі нашай незалежнай дзяржавы», — сказаў міністр. Ён звярнуў увагу, што тэма COVID-19 чырвонай стужкай праходзіць праз апошнія паўтара года і адпаведныя эпідэміялагічныя ўмовы наклалі свой адбітак на жыццё і работу беларускіх медыкаў.

Дзмітрый Піневіч расказаў журналістам, як складваецца сітуацыя сёння: «Нават цяпер, калі ў нас не 35 тысяч перапрафіляваных ложкаў, а 11 тысяч, гэта ўсё роўна шмат. Застаюцца актуальнымі пытанні сацыяльнага дыстанцыравання, вакцынацыі. Вельмі важна, што разам з барацьбой і лячэннем ковіду мы не спынялі лячэнне па ўсіх астатніх профілях».

У пачатку 2021 года Беларускі прафсаюз работнікаў аховы здароўя заснаваў нагрудны знак «За працу ў імя жыцця». Узнагарода будзе ўручацца работнікам, якія прыкладаюць усе намаганні ў барацьбе за здароўе пацыентаў, асабліва падчас пандэміі каранавіруса. Адным з першых уладальнікаў узнагароды стаў Галоўны пазаштатны інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ Ігар Карпаў.

«Мне б вельмі хацелася, каб гэтая ўзнагарода стала масавай, бо масавымі былі праца і намаганні медыцынскіх работнікаў. Нельга забываць пра людзей, якія аказвалі дапамогу, не з'яўляючыся публічнымі персонамі. Узнагарода павінна іх знайсці, гэта павага, якую неабходна праяўляць да гэтых людзей за іх самаадданую працу», — адзначыў Ігар Карпаў.

Нават падчас святочнага мерапрыемства доктар не забыўся на свае абавязкі і папярэдзіў, што сітуацыя з каранавірусам застаецца сур'ёзнай і расслабляцца рана. «Ёсць адчуванне, што страчана пільнасць. Але яшчэ не час. Канчаткова расслабляцца будзем тады, калі ўсё нармалізуецца, гэты час абавязкова наступіць. Шмат у чым гэта залежыць ад нас, ад інтэнсіўнасці прышчэпнай кампаніі, якая цяпер праводзіцца. Тыя эпідэміялагічныя даныя па людзях, якія маюць імунітэт, павінны быць успрыняты з насцярожаным аптымізмам, але ўсё ж з аптымізмам. Самае галоўнае — памятаць, што небяспека захворвання ёсць», — падкрэсліў прафесар.

Сёлета дзве беларускія медыцынскія сястры атрымалі медаль імя Флорэнс Найтынгейл. Адна з іх, Людміла Бузель, спецыяліст аддзела медыка-сацыяльнай работы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, расказала, што ў Беларусі ўсяго 14 медыцынскіх сясцёр маюць гэты медаль. «Галоўны крытэрый для атрымання ўзнагароды — міласэрнае стаўленне да людзей, клопат пра іх. Наша медыка-сацыяльная служба клапоціцца аб самотных, пажылых людзях, якія не могуць самі сябе абслугоўваць. Мая праца — маё жыццё, я без гэтага не магу», — сказала Людміла Іванаўна.

Другая гераіня дня — Эльвіра Шабанава — жыве і працуе ў Лідзе. Медыцынская сястра Лідскай вузлавой арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Беларускай чыгункі дапамагае людзям 32 гады. «Медаль імя Флорэнс Найтынгейл — гэта ацэнка маёй працы і ўсіх медыцынскіх сясцёр міласэрнасці. У Чырвоны Крыж прыходзяць і сыходзяць ці прыходзяць і застаюцца назаўжды», — падзялілася Эльвіра Мікалаеўна.

Экскурсанты наведалі ўсе залы, дзе праходзяць важныя ўрачыстыя і палітычныя падзеі. А падчас пераходаў паміж імі паспелі пагаварыць з калегамі, якіх даўно не бачылі, абмяняцца навінамі і павіншаваць з надыходзячым святам. Некаторыя з іх прыехалі сюды адразу з работы. Напрыклад, Дзмітрый Данілаў, прафесар кафедры інфекцыйных захворванняў БДМУ, яшчэ раніцай працаваў у рэанімацыі, а днём ужо быў на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці.

«Мы кожны дзень працуем з пацыентамі, рэанімацыя — справа неадназначная, гэта заўсёды самыя цяжкія пацыенты. Для паўнаты адчування прафесійнага свята не хапае таго, каб каранавірус адступіў. Разуменне, што заўтра нічога не заканчваецца і што гэта не кропка, а коска і часовая перадышка, не дае магчымасці расслабіцца, — падкрэсліў Дзмітрый Данілаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

Лісты медсястры

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як і гераіня Шамякіна, жыхарка Хойнікаў працавала галоўнай медсястрой інфекцыйнага аддзялення. Службу несла ў ваенным шпіталі горада Шындант у Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан.

Калі з нагоды Дня медыцынскага работніка шукала гераіню для артыкула, вырашыла расказаць менавіта пра Марыну Рыгораўну. Гісторыя гэтай сястрычкі-«афганкі» — пра радзіму як не толькі месца, дзе нарадзіўся, але і час, у якім жывеш.

— У 1982 годзе я скончыла Гомельскае медвучылішча, прыехала па размеркаванні ў родныя Хойнікі, — расказала яна. — Працаваць накіравалі працэдурнай медсястрой у інфекцыйнае аддзяленне райбальніцы. Мне пашчасціла: мой калектыў быў самы лепшы ў свеце, а ўзначальваў яго самы таленавіты ўрач-інфекцыяніст Аляксандр Хаванскі. У 1985-м мне пайшоў якраз дваццаць другі год, а мая старэйшая сястра паехала разам з мужам служыць у Германію. Я таксама марыла паехаць з ёю. Прыйшла ў прафкам і пытаюся: ці адпраўляюць медыкаў у ГДР. Мне адмовілі, але ж прапанавалі: медыкі-добраахвотнікі вельмі патрэбныя ў Афганістане, паедзеш? Я згадзілася.

ЗВЫШСЛУЖБА БЕЗ ЗВЫШУРОЧНЫХ

З Гомельскай вобласці добраахвотнікамі з грамадзянскіх служачых запісалася сем чалавек. Марына Рыгораўна так больш ні з кім з іх потым не сустрэлася. У ваенны шпіталь у горадзе Шындант яе накіравалі адну.

— Перад паездкай некалькі месяцаў маю кандыдатуру правяралі праз спецыяльны аддзел КДБ, збіралі сведкі з біяграфіі, — працягнула суразмоўніца. — Можа, давалі час перадумаць? Калі прыехала, пайшла да начальніка шпіталя на размеркаванне. Спыталі, дзе працавала і што магу рабіць. Зацікавіліся, калі расказала, што ў інфекцыйным аддзяленні. Накіравалі ў аддзяленне, дзе лячэнне праходзілі хворыя на брушны тыф. Мяне быццам Бог рыхтаваў загадзя да такога лёсу. У нас у Хойніках, калі я працавала пасля медвучылішча, у вёсцы Віць адбылася ўспышка якраз брушнога тыфу. Наш калектыў аддзялення тады вельмі добра спрацаваў, успышку пагасілі. Выходзіць, я прыехала ўжо падрыхтаваная — ставіла да 70 кропельніц у дзень.

Марына Рыгораўна дадае, што першыя паўгода кожны дзень пісала лісты дадому — быццам дзявочы дзённік вяла:

Марына ТАРАСАВЕЦ *(злева)* каля ваеннага шпіталя ў горадзе Шындант марыць адшукаць сваю сяброўку Людмілу з Роўна.

— Я ў школе добра вучылася, марыла потым у медуніверсітэт паступаць, але вельмі любіла літаратуру, пісала сачыненні. Дык вось у лістах да мамы падрабязна апісвала сваю работу ў шпіталі, жыццё ў медыцынскім модулі. Гэта мабільны лагер для пражывання медыкаў, зроблены са шчытоў фанеры. Пісала маме, як мы працуем з хворымі, як я дзяжуру да самай ночы.

Лячылі ў тым шпіталі савецкіх вайскоўцаў, але не адмаўлялі ў медыцынскай дапамозе і мясцовым жыхарам. Асабліва жанчын шмат прымалі, кажа Марына Рыгораўна:

— Лісты да Хойнікаў дайшлі, але мама ўсё спаліла — не пакінула ніводнага. Тады мяне гэта вельмі кальнула. Цяпер з цягам часу згадваю свае лісты. Памяць падводзіць, а так хочацца ўспомніць прозвішчы сябровак, з якімі перажылі самую неверагодную для мяне школу жыцця. Я згубіла з імі сувязь і не памятаю прозвішчаў. Хочацца і дзецям паказаць гэтыя лісты і ўнукам. Бо гэта мары, думкі, перажыванні маладой дзяўчыны, якая з ускраіны Гомельшчыны трапіла на чужую старонку амаль за чатыры тысячы кіламетраў.

Між тым Марына Тарасавец заўсёды асэнсоўвала сябе часткай вялікай краіны, дачкой і сястрой для рускіх, казахаў, украінцаў, татар, з якімі давялося разам служыць-працаваць, ратавацца ад баявых налётаў. Я пытаюся ў Марыны Рыгораўны, чаму яе маці спаліла тыя афганскія лісты? Адказвае: такім было савецкае пасляваеннае выхаванне. Калі шкадаваць, песціць сваіх дзяцей нельга, бо сапсуеш. Паказваць эмоцыі нельга, а ў лістах тых жалоба, душа навыварат. Маці, выходзіць, саромелася такой душэўнай адкрытасці, пяшчоту хавала за строгасцю, а сама, безумоўна, вельмі любіла, шкадавала сваю Марышку.

ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ

Расказвае, што памятае жахлівыя ўмовы надвор'я ў далёкай краіне: вакол пясок ды камяні, але той пясок — як цэмент. Неймаверная спёка. Дзяўчына вельмі сумавала па снегу, святкаванні Новага года.

— Праз некалькі месяцаў, як мы казалі, «адлятала на дэмбель» старэйшая медсястра інфекцыйнага аддзялення, — згадвае гераіня. — Начальства паклікала мяне і кажа: «Вы гатовы добры спецыяліст, прызначаем вас галоўнай медсястрой інфекцыйнага аддзялення для лячэння хворых з гепатытам і дызентэрыяй». Я адмаўлялася, але гэта армія: ніхто загады не абмяркоўвае. Як вольнанаёмная магла з'ехаць, але пра гэта нават не думала, бо хто будзе працаваць? Два гады звычайна медсёстры працавалі, потым «адляталі на дэмбель». Пры мне ніхто не з'ехаў раней, вытрымлівалі. Мяне ж вельмі прасілі — вось я і засталася на большы тэрмін, чым астатнія. Ужо ў 1987—1988 гадах вольнанаёмныя не асабліва рваліся прыязджаць туды, таму медыкаў не хапала.

Марына Тарасавец пяць разоў была донарам крыві для вайскоўцаў, пакуль работа ў інфекцыйным аддзяленні не закранула і яе здароўе. Яна ведае, што частка савецкага жаночага медперсаналу памерла на службе менавіта ад цяжкіх інфекцыйных хвароб. Успамінае, наколькі адказна было працаваць на пасадзе галоўнай медсястры ў інфекцыйным аддзяленні:

— Адказваеш галавой — гэта ж інфекцыёнка! Дэзынфекцыя, санітарны дзень ложкаў, посуду, адзення, нават знешні выгляд хворых — усё гэта трэба было пракантраляваць. Да таго ж дапамагала сваім сястрычкам, калі не спраўляліся. Прасілі: ну папрацуй, дапамажы... Даволі часта з раніцы да ночы была на змене.

З-за суровага клімату ваенныя часта заражаліся брушным тыфам і гепатытам, толькі папіўшы сырой вады. У суткі прывозілі па сотні хворых. У перыяд эпідэміі іх колькасць сягала за тысячу. А праца была наогул без выхадных.

— Я заўсёды кажу: гэта трэба дзякаваць Богу, што нашы савецкія жанчыны згадзіліся і паехалі туды. Колькі ж раненых, хворых — хто дапамагаў бы спраўляцца? А яшчэ ж патрэбны былі і цырульнікі, прачкі, бухгалтары, тэлефаністкі, прадаўцы, работнікі камунгаса, слесары, зваршчыкі... Шмат хлопцаў, якія мелі грамадзянскія спецыяльнасці, прыязджалі.

Яна «паляцела на дэмбель», адслужыўшы тры гады. Амаль праз паўгода савецкія войскі былі выведзены з Афганістана.

НА РАДЗІМУ З МЕДАЛЁМ

Марына Тарасавец вярнулася з Афганістана з медалём «За працоўную доблесць». Аб тым, як пасля вяртання дадому вайна не адпускала, яна расказваць не любіць. Памяць імкнецца выдаліць з успамінаў хлопцаў на бальнічных ложках, вочы, якія просяць міласэрнасці і дапамогі.

— Калі пытаюць мяне, што я даведалася ў той камандзіроўцы, адказваю: тое, што жыццё — гэта самае галоўнае, а мірнае неба над галавой — не пустыя словы. На маіх вачах прывезлі цела добрага сябра — малодзенькага капітана з Палтавы. Ён ехаў на БТР, і снайпер стрэліў яму ў галаву. Я памятаю яго да гэтага часу.

Але памятае Марына Рыгораўна і шмат добрага і радаснага. Як з канцэртамі прыляталі зоркі савецкай эстрады — фота з аўтографам Аляксандра Разенбаума да гэтага часу захоўвае ў альбоме. Як ладзілі танцавальныя вечарыны, сябравалі, арганізоўвалі суботнікі. Захавала Марына Рыгораўна і японскі магнітафон, які прывезла з Афганістана. Тады ў глыбінцы такая тэхніка была дзівоснай. Прынамсі, дагэтуль слухае на ім касеты.

Пасля вяртання дадому, у Хойнікі, Марына Тарасавец зноў выйшла на работу ў раённую бальніцу. Іншых запісаў у яе працоўнай кніжцы няма. Цяпер яна медсястра Хойніцкай райбальніцы, але выконвае свае службовыя абавязкі ў дзіцячым садку № 1. Увогуле, дзеці — гэта тое, што дало ёй магчымасць не растварацца ў перажываннях ваеннага мінулага. У яе мірным жыцці — сын Вадзім і дачка Дар'я, унучак Дамінік. Яны ўсе ганарацца сваёй маці і бабуляй. Марына Рыгораўна прызнаецца: калі здымалі рэпартаж у Гомелі з цырымоніі ўзнагароджвання «Жанчына года», у глыбіні душы спадзявалася, што пазнаюць яе старыя сяброўкі-сястрычкі і лёс падорыць з імі сустрэчу.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота з сямейнага архіва гераіні.

ЯК РАЗАМ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ СУЧАСНЫМ ВЫКЛІКАМ?

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се СЯАЮН расказаў «Звяздзе» пра супольнасць адзінага лёсу чалавецтва

— 21 мая адбыўся Глабальны саміт па пытаннях аховы здароўя. У сваім выступленні пад назвай «Агульнымі намаганнямі фарміраваць супольнасць адзінай аховы здароўя чалавецтва» старшыня КНР Сі Цзіньпін яшчэ раз заклікаў усе краіны свету «поплеч непахісна прасоўваць міжнароднае супрацоўніцтва ў барацьбе з эпідэміяй, агульнымі намаганнямі садзейнічаць фарміраванню супольнасці адзінай аховы здароўя чалавецтва і сумесна абараняць цудоўную будучыню здароўя чалавецтва», — згадаў Се Сяаюн. — Ва ўмовах самай страшнай пандэміі інфекцыйнага захворвання за стагоддзе, улічваючы агульныя патрэбы ўсіх краін для перамогі над эпідэміяй COVID-19 і аднаўлення эканамічнага росту, Сі Цзіньпін вылучыў пяць прапаноў Кітая. Яны зыходзяць з таго, што краінам свету неабходна прытрымлівацца прынцыпу «народ перш за ўсё, жыццё вышэйшае за ўсё», арганізоўваць навукова абгрунтаваныя і комплексныя меры рэагавання, умацоўваць дух салідарнасці і супрацоўніцтва для сумеснага пераадолення бягучых выклікаў. Варта ў справядлівым і рацыянальным ключы ліквідаваць «імунны дысбаланс» і нарэшце прымаць меры па ліквідацыі прычын і наступстваў у мэтах удасканалення сістэмы кіравання. Старшыня КНР задаў кірунак для далейшай сумеснай барацьбы з эпідэміяй, а таксама зрабіў яшчэ адзін сур'ёзны крок у працэсе пабудовы супольнасці адзінай аховы здароўя чалавецтва.

Фота Бел ТА.

ПЯЦЬ НАПРАМКАЎ

Сённяшні свет сутыкнуўся са шматлікімі праблемамі, такімі як сацыяльны раскол, супрацьстаянне этнічных груп, эканамічны спад і незбалансаванае развіццё. Неабходна не толькі разбірацца з такімі традыцыйнымі рызыкамі, як бесперапынныя ваенныя смуты і рэгіянальныя канфлікты, але і змагацца з нетрадыцыйнымі пагрозамі бяспекі, такімі як змяненне клімату і тэрарызм, — адзначыў Се Сяаюн. — Кардынальнае пераўтварэнне сістэмы глабальнага кіравання і трансфармацыя міжнароднага парадку з'яўляюцца неадкладнай і цяжкай задачай. Куды рухаецца свет? Дзе шлях развіцця? Вывучэнне гэтых пытанняў і пошук іх вырашэння — гэта тэрміновая неабходнасць для чалавецтва.

У палітычных справах мяркуецца праяўляць узаемную павагу, праводзіць кансультацыі на раўнапраўнай аснове, імкнуцца да стварэння працяглага міру ў свеце.

Менавіта на фоне падзей нашай эпохі ў сакавіку 2013 года старшыня КНР Сі Цзіньпін прадставіў свету важную ініцыятыву ў сваім выступленні ў Маскоўскім інстытуце міжнародных адносін — упершыню вылучыў канцэпцыю Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва. Пазней падчас розных міжнародных мерапрыемстваў ён растлумачыў матывы, бачанне і шляхі рэалізацыі, паступова ўдасканальваючы, пераварыў яе ў кітайскі план вырашэння агульных праблем у свеце.

Ініцыятыва стварэння Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва, вылучаная Кітаем, уяўляе з сябе новае глабальнае бачанне, якое выступае за пошук агульных падыходаў пры захаванні адрозненняў і інклюзіўнага развіцця краін з рознымі сацыяльнымі сістэмамі, ідэалогіямі, гісторыка-культурнымі кантэкстамі і ўзроўнямі развіцця. Яна прапануе ўдасканаленне свету ў пяці асноўным галінах. У палітычных справах мяркуецца праяўляць узаемную павагу, праводзіць кансультацыі на раўнапраўнай аснове, імкнуцца да стварэння працяглага міру ў свеце. У галіне бяспекі варта комплексна рэагаваць на традыцыйныя і нетрадыцыйныя пагрозы, імкнуцца пабудаваць усебаковы, устойлівы, бяспечны для ўсіх свет, заснаваны на супрацоўніцтве. У галіне эканомікі неабходна абараняць і ўдасканальваць эканамічную глабалізацыю, імкнуцца пабудаваць квітнеючы свет, заснаваны на ўзаемавыйгрышным супрацоўніцтве і сумесным развіцці. У галіне культуры трэба паважаць разнастайнасць сусветных культур і імкнуцца да пабудовы адкрытага, інклюзіўнага свету, талерантнага да розных цывілізацый, якія падтрымліваюць кантакты і вучацца адна ў адной. У пытаннях экалогіі мяркуецца супрацоўнічаць для рэагавання на змяненне клімату, імкнуцца пабудаваць чысты, цудоўны свет, у якім паважаюць прыроду і падтрымліваюць «зялёнае» развіццё.

АД КІБЕРПРАСТОРЫ ДА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ

У якасці канкрэтнага шляху рэалізацыі Кітай паслядоўна прапануе стварыць Супольнасці адзінага лёсу ў кіберпрасторы, у галіне ядзернай бяспекі, аховы здароўя чалавецтва, Марскую супольнасць. Яны адпавядаюць тэндэнцыям часу, такім як мір, развіццё, супрацоўніцтва і ўзаемны выйгрыш, дзень за днём узбагачаюць Супольнасць адзінага лёсу чалавецтва новым зместам, забяспечваюць больш дакладную інструкцыю для практычных даследаванняў у розных сферах.

У галіне бяспекі варта комплексна рэагаваць на традыцыйныя і нетрадыцыйныя пагрозы, імкнуцца пабудаваць усебаковы, устойлівы, бяспечны для ўсіх свет, заснаваны на супрацоўніцтве.

На працягу апошніх васьмі гадоў Кітай не толькі актыўна выступаў з ініцыятывамі і прапановамі, але і ажыццяўляў іх. Стварэнне «Аднаго пояса, аднаго шляху» ў значнай ступені спрыяла агульнаму развіццю ўсіх краін-удзельніц, прынесла народам гэтых дзяржаў станоўчыя дасягненні. Сёння ён — сусветна папулярны грамадскі прадукт, які назапашвае вопыт для ліквідацыі дысбалансу і бязладзіцы ў глабальным кіраванні, а таксама закладвае аснову для стабільнасці і такім чынам стымулюе пабудову Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва. Пратэкцыянізм, унілатэралізм і іншыя процідзейныя станоўчаму развіццю сілы перашкаджаюць канструктыўнаму міжнароднаму ўзаемадзеянню. Рэагуючы на гэта, Кітай актыўна стварае новыя платформы, — заўважыў Се Сяаюн, — заснаваў Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый, неаднаразова арганізоўваў паспяховыя імпартныя кірмашы, на якіх было падпісана мноства здзелак аб супрацоўніцтве і аб куплі-продажы тавараў паміж Кітаем і замежнымі партнёрамі. Умоўна кажучы, усё гэта напаўняла «торт» шматбаковага міжнароднага супрацоўніцтва ўсё большай колькасцю «слаёў», умацоўваючы ўзаемадзеянне паміж КНР і іншымі краінамі і акумулюючы грандыёзныя сілы для сумеснага будаўніцтва глабальнай Супольнасці.

Ад Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва Кітай—Еўропа да Супольнасці Кітай—Афрыка, ад Супольнасці суседніх краін, Азіяцка-Ціхаакіянскай Супольнасці да двухбаковых міждзяржаўных Супольнасцяў у розных формах. Пабудова адзінкавых, двухбаковых або шматбаковых Супольнасцяў адзінага лёсу чалавецтва ў розных рэгіёнах свету і на розных узроўнях утварае канцэнтрычныя кругі ўзаемавыйгрышнага супрацоўніцтва. Гэта сведчанне інтэграцыі інтарэсаў і агульнасці лёсу паміж КНР і краінамі свету, уключаючы Беларусь, а таксама дэманструе, што «Кітай і яго партнёры могуць падзяляць сапраўднае значэнне Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва для міру і росквіту» (словы Хелена Кларка, адміністратара Праграмы развіцця ААН).

МУДРАСЦЬ І СІЛА

Асабліва падчас глабальнай эпідэміі COVID-19 кітайскі народ на чале са Старшынёй Сі Цзіньпінам пачаў самую маштабную глабальную гуманітарную акцыю ў гісторыі Новага Кітая, падзяліўся кітайскай мудрасцю і сілай у глабальнай барацьбе з эпідэміяй. КНР у поўнай меры рэалізавала «Ініцыятыву краін G20 па замарозцы даўгоў найбяднейшых краін» на агульную суму больш за 1,3 мільярда доларaў ЗША, стаўшы дзяржавай з самай вялікай сумай замарожанага доўгу сярод членаў G20, — падкрэсліў Се Сяаюн.

Маючы абмежаваныя вытворчыя магутнасці і па-ранейшаму вялізны попыт унутры краіны, Кітай выканаў свае абавязацельствы, узятыя на 73-й сесіі Сусветнай асамблеі аховы здароўя ў мінулым годзе. Ён аказаў гуманітарную дапамогу вакцынамі больш чым 80 краінам, якія развіваюцца, востра маюць патрэбу ў іх, і экспартаваў вакцыны ў 43 краіны. Агульная колькасць доз, выдзеленых Кітаем, дасягнула 300 мільёнаў. Кітай таксама выдзеліў 2 мільярды доларaў ЗША ў якасці гуманітарнай дапамогі пацярпелым ад эпідэміі краінам, якія развіваюцца, на барацьбу з эпідэміяй і аднаўленне сацыяльна-эканамічнага развіцця, супрацьэпідэмічную матэрыяльную гуманітарную дапамогу больш чым 150 краінам і 13 міжнародным арганізацыям. Па ўсім свеце было пастаўлена больш чым 280 мільярдаў масак, звыш 3,4 мільярда адзінак ахоўнай вопраткі і больш за 4 мільярды тэставых набораў для выяўлення віруса.

На Глабальным саміце па пытаннях аховы здароўя, які адбыўся 21 мая, Старшыня Сі Цзіньпін даў сур'ёзнае абяцанне ад імя ўрада і народа Кітая аб тым, што ў найбліжэйшыя тры гады КНР дадаткова выдзеліць 3 мільярды доларaў ЗША для пераадолення пандэміі ў краінах, якія развіваюцца, і аднаўлення іх сацыяльна-эканамічнага развіцця. Наша дзяржава падтрымлівае айчынных вытворцаў вакцын у перадачы тэхналогій краінам, якія развіваюцца, і сумеснай вытворчасці. Кітай вітае адмену правоў інтэлектуальнай уласнасці на вакцыны ад COVID-19, а таксама прыкладзе максімум намаганняў для павелічэння іх паставак за межы краіны.

У галіне эканомікі неабходна абараняць і ўдасканальваць эканамічную глабалізацыю, імкнуцца пабудаваць квітнеючы свет, заснаваны на ўзаемавыйгрышным супрацоўніцтве і сумесным развіцці.

Праз шэраг практычных дзеянняў Кітай рэалізаваў ускладзеную на сябе адказнасць буйной дзяржавы і выканаў свае абяцанні ў пабудове Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва, чым заваяваў усеагульнае сусветнае прызнанне і адабрэнне. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый уключыла канцэпцыю Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва ў рэзалюцыю ААН 10 лютага 2017 года. Яна таксама была ўключана ў рэзалюцыю Савета Бяспекі 17 сакавіка 2017-га і ў рэзалюцыю Савета ААН па правах чалавека 23 сакавіка 2017 г. Пабудова Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва паступова становіцца агульным ідэалам і мэтай для народаў усіх краін.

ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО

Сутнасць Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва заключаецца ў сумесным будаўніцтве, сумесным выкарыстанні і сумесным выйгрышы. У апошнія гады пад стратэгічным кіраўніцтвам і дзякуючы асабістаму клопату Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускія адносіны даверлівага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дэманструюць стабільнае развіццё на высокім узроўні, — адзначыў Се Сяаюн. — Будаўніцтва Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва Кітая і Беларусі дасягнула выдатных вынікаў. Палітычны ўзаемадавер паміж дзвюма краінамі бесперапынна паглыбляецца. Абодва бакі цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго па пытаннях, якія датычацца ключавых інтарэсаў і важных заклапочанасцяў. Ажыццяўляецца цесная каардынацыя ў міжнародных справах. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі бесперапынна ўмацоўваецца. Працягвае развівацца ўзаемадзеянне ў сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху». Супрацоўніцтва ў буйных праектах мае цудоўныя вынікі. Узаемадзеянне ў сферы адукацыі, навукі і тэхналогій, культуры і іншых галінах працягвае захоўваць добрую дынаміку.

У галіне культуры трэба паважаць разнастайнасць сусветных культур і імкнуцца да пабудовы адкрытага, інклюзіўнага свету, талерантнага да розных цывілізацый, якія падтрымліваюць кантакты і вучацца адна ў адной.

Кітай і Беларусь асабліва суперажываюць і дапамагаюць адзін аднаму ў сумеснай барацьбе з эпідэміяй COVID-19 і пабудове Супольнасці аховы здароўя. Гэта стымулявала рэалізацыю Супольнасці адзінага лёсу Кітая і Беларусі. Старшыня Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка шматразова абменьваліся думкамі і давалі важныя даручэнні па ўмацаванні кітайска-беларускага супрацьэпідэмічнага супрацоўніцтва, развіцці двухбаковых адносін і паглыбленні ўзаемадзеяння ў розных сферах на фоне эпідэміі COVID-19. Народы дзвюх краін разам пераадольваюць няшчасце, дапамагаюць адзін аднаму змагацца з навалай.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка двойчы даручаў аказаць гуманітарную супрацьэпідэмічную дапамогу кітайскаму боку, якая дастаўлялася ваеннымі самалётамі. Кітайскі ўрад, прадпрыемствы, мясцовыя органы ўлады і Пасольства Кітая ў Беларусі таксама неаднойчы арганізоўвалі дастаўку беларускаму боку ў якасці падтрымкі гуманітарнай супрацьэпідэмічнай дапамогі. Эксперты ў галіне медыцыны дзвюх краін неаднойчы праводзілі відэаканферэнцыі для абмену вопытам барацьбы з эпідэміяй. Пасля таго як Кітай распрацаваў вакцыну ад COVID-19, ён двойчы аказваў Беларусі бязвыплатную гуманітарную дапамогу ў яе прадастаўленні.

У пытаннях экалогіі мяркуецца супрацоўнічаць для рэагавання на змяненне клімату, імкнуцца пабудаваць чысты, цудоўны свет, у якім паважаюць прыроду і падтрымліваюць «зялёнае» развіццё.

Мы ўпэўненыя, што па меры далейшага здаровага і стабільнага развіцця кітайска-беларускіх адносін і новых вынікаў двухбаковага дзелавога супрацоўніцтва ў розных галінах, стварэнне Супольнасці адзінага лёсу паміж Кітаем і Беларуссю, несумненна, прынясе яшчэ большую карысць нашым краінам і народам, а таксама ўнясе свой уклад у пабудову глабальнай Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва ва ўсім свеце.

Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 08 июля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212
Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17
Начальная цена – 874 561,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка – 87 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ №527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **08 июля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 23.06.2021 по 06.07.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 08 июля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1
Начальная цена: 1 885 851,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 188 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **08 июля 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **23.06.2021 по 06.07.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 30 июня 2021 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-133417 площадью 422,3 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – магазин
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Ленина, 34-166
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001000826, площадь 0,4579 га (доля в праве 301/10000); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания жилого дома и изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду
Начальная цена продажи с учетом НДС: 981 960,00 бел. руб.
Задаток (10 %) с учетом НДС: 98 196,00 бел. руб.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактный телефон +375 29 334-04-60.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY53BPSB30121470060139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гомель, ул. Крестьянская, 29а, БИК BPSBBY2X.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 28.06.2021 г. в 17.00.**

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десять)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Аукцион № 5268
ЛОТ № 29583 – ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, д. Мировщина Дятловского р-на

Капитальное строение, инвентарный номер 451/С-14705, площадь – 96,9 кв. м, целевое назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Мировщина, ул. Дятловская, 14.
Принадлежности: склад, ограждение, бетонное покрытие.
Площадь земельного участка, на котором располагается магазин, – 0,1075 га, кадастровый номер 422380307101000072. Назначение – обслуживание магазина. Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании земель.
Здание магазина одноэтажное. Стены кирпичные. Перекрытия деревянные, кровля шиферная. Полы: бетон, линолеум. Оконные рамы деревянные. Двери: деревянные, металлические. Водопровод и канализация отсутствуют. Отопление автономное, осуществлялось от котла на твердом топливе.
Начальная цена продажи – 3 539,81 руб. (три тысячи пятьсот тридцать девять белорусских рублей 81 коп.), в т. ч. НДС.

Дата и время начала электронных торгов: 17.06.2021 09.24.
Дата и время завершения электронных торгов: 08.07.2021 16.00.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по адресу лота: **https://torgi.gov.by/lot/29583/5268/magazin-d-mirovshina-dyatlovskogo-r-na** необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел.: 8 (01563) 64581, 68264**

Организатор аукционов – государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел.: 8 (017) 200-73-33, 200-64-11**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 календарных дней с момента определения победителя торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента определения победителя торгов

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109 ОКПО: 37533622, государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»

Для участия в торгах претенденту необходимо зарегистрироваться до начала торгов на торговой площадке согласно инструкции: **https://torgi.gov.by/instruction**
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении повторных электронных торгов 2021.Ч.002.00020 по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: открытое акционерное общество «Автомобильная транспортно-экспедиционная компания», г. Витебск, тел. +375 (212) 26 12 10.

Организатор, оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 48-20-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения повторных торгов: 05.07.2021 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 1320-031, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9B0001312, цвет – зеленый, рег. знак АЕ 6735-2. **Нач. цена:** 14490,00 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 1 449,00 бел. руб.
Лот № 2. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 – 1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000412, цвет – темно-красный, рег. знак АЕ 4175-2. **Нач. цена:** 13 230,00 бел. руб. без НДС. **Задаток**: 1 323,00 бел. руб.
Лот № 3. Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 – 1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000423, цвет – темно-зеленый, рег. знак АЕ 4301-2. **Нач. цена:** 12 530,00 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 1 253,00 бел. руб.
Лот № 4. Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M975830A0004114, цвет – зелено-белый, рег. знак А 2621 А-2. **Нач. цена:** 6 020,00 бел. руб. без НДС. **Задаток** 602,00 бел. руб.
Лот № 5. Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M975830A0004102, цвет – зелено-белый, рег. знак А 2622 А-2. **Нач. цена:** 5 390,00 бел. руб. без НДС. **Задаток** 539,00 бел. руб.
Лот № 6. Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830-(3022), 2012 г. в., кузов (рама) № Y3M975830C0005686, цвет – черно-серый, рег. знак А 4862 А-2. **Нач. цена:** 8 000,00 бел. руб. без НДС. **Задаток** 800,00 бел. руб.
Местонахождение имущества: г. Витебск, ул. Терешковой, 11

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом ЭТП. **Для участия в повторных электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах в порядке, размещенном на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 02.07.2021.** Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».
Условия электронных торгов: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, необходимой для проведения торгов, оплатить услуги ЭТП в соответствии с прейскурантом ЭТП; оплатить НДС сверх цены приобретенного имущества; заключить договор купли-продажи имущества в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе: «транспорт». Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (212) 52 51 61.

1 июля 2021 года состоится XVIII Конференция ОО «МЖК г. Минска»

Повестка дня
1. Отчет правления и ревизионной комиссии.
2. Избрание в выборные органы.
3. Разное.

Место проведения: г. Минск, ул. Шафарнянская, д. 1, пом. 153 (образовательный центр объединения).
Начало регистрации в 19.00.
Избрание делегатов состоится 23 июня 2021 г. в 19.00 по адресу: г. Минск, ул. Шафарнянская, 1-153.

УНП 100124282

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№1487600–1487602, 1599049, 1608939, 1816488–1816492, 1816501, 1816508, 1816518–1816521, 1816525-1816527, 1816530.

УНП 100782388

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

18 чэрвеня 2021 г. № 23 (608)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЛЕТА Ў ГОРАДЗЕ

ФАРБЫ ПРЫРОДЫ І ДУШЫ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Летам у глыбінцы асаблівай розніцы паміж невялікім горадам і вёскай няма: амаль такое ж паветра, а лес, рэчка ці возера звычайна калі не побач, то непадалёку. А вось у абласным цэнтры, а тым больш у сталіцы, гэтае падабенства знікае. Не сказаць, што ў Мінску яго жыхары без лецішча ці доміка ў вёсцы ў летні спякотны дзень адчуваюць сябе зусім як у «каменных джунглях», але дыхаецца ім у вялікім горадзе не так, як на прыродзе.

стар. 18

З ГІСТОРЫІ ПЫТАННЯ

ПАРЛАМЕНЦКАЕ ВЫМЯРЭННЕ ІНТЭГРАЦЫІ

Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўяўляюць з сябе эфектыўны сумесны праект Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Расіі. Калі лаканічна, то можна сказаць, што гісторыя форумаў — гэта ў пэўным сэнсе і парламенцкая гісторыя поспеху. Бо такія штогадовыя сустрэчы партнёраў і перагаворы на практыцы пацвердзілі сваю запатрабаванасць рэгіёнамі абедзвюх краін і маюць устойлівую тэндэнцыю да далейшага развіцця.

Ад харчавання да высокіх тэхналогій

Пачыналася ўсё са зразумелага і жыццёва важнага — забеспячэння харчовай бяспекі дзвюх дзяржаў. Зазірнём у пачатак чэрвеня 2014 года ў Мінск, дзе праходзіў першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ён сабраў каля 300 удзельнікаў, якія засяродзіліся на абмеркаванні і пошуку шляхоў павышэння эфектыўнасці развіцця аграпрамысловых комплексаў.

Паколькі падобны форум праводзіўся ўпершыню, яго асноўнай мэтай у значнай ступені было максімальнае садзейнічанне ўстанаўленню новых сувязяў і пашырэнню ўжо існуючых прамых кантактаў паміж рэгіёнамі. І з гэтай задачай сенатары верхніх палат беларускага і расійскага парламентаў справіліся. Яны аказалі дапамогу, напрыклад, па лініі заканадаўчай і выканаўчай галін улады, у выпрацоўцы рэкамендацый па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы для паскарэння развіцця аграпрамысловага сектара Беларусі і Расіі ва ўмовах стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза.

Удзельнікі форуму за два дні яго работы паспелі дамовіцца аб канкрэтных праектах, падпісалі шэраг дакументаў, якія датычыліся стымулявання беларуска-расійскага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Таксама ўдалося абмеркаваць як праблемы, так і перспектывы ды магчымасці актывізацыі ўзаемадзеяння ў АПК.

Тады ўдзельнікі форуму аднадушна выказаліся за павелічэнне экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі ў трэція краіны, вырашылі выпускаць больш экалагічна чыстай прадукцыі.

Другі Форум рэгіёнаў адбыўся ў Сочы ў верасні 2015 года і быў прысвечаны агульным падыходам і рэгіянальным аспектам рэалізацыі прамысловай палітыкі Саюзнай дзяржавы. Колькасць яго ўдзельнікаў у параўнанні з першым форумам павялічылася ўдвая. Прыехалі прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай галін улады Беларусі і Расіі, рэгіёнаў краін, кіраўнікі буйных прадпрыемстваў і бізнес-супольнасцяў.

стар. 8

НАПЯРЭДАДНІ

«Анлайн» дыктуе фармат

Сёлетні Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі прысвечаны навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву дзвюх краін у эпоху лічбавізацыі

Восьмы па ліку форум гэтым разам прымаюць Масква і прысталічны рэгіён, але шмат мерапрыемстваў запланавана ў фармаце відэаканферэнцый. Нагадаем, што ён ужо блізіцца і пройдзе з 29 чэрвеня да 1 ліпеня. Чаго чакаць ад чарговых афлайн- і анлайн-сустрэч даведалася карэспандэнт «МС».

Найперш трэба сказаць, што мерапрыемства праводзіцца пад эгідай верхніх палат парламентаў дзвюх дзяржаў — Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі пры ўдзеле ўрада Маскоўскай вобласці.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента, у першы дзень, 29 чэрвеня, беларускія і расійскія парламентарыі возьмуць удзел у рабоце секцыйных пасяджэнняў у фармаце відэаканферэнцый паміж Масквой і Мінскам.

З самай раніцы распачнуцца секцыі «Напрамкі развіцця расійска-беларускага супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі ў эпоху вялікіх выклікаў і лічбавых тэхналогій» і «Роля лічбавізацыі ў фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы».

Пасля абеду запланаваны секцыі «Удасканаленне ўзаемадзеяння Расіі і Беларусі па пытаннях рэалізацыі саюзных праграм і навукова-тэхналагічных праектаў у рамках міжнародных дагавораў», «Права і лічбавізацыя ў Саюзнай дзяржаве: перспектывы і напрамкі», а таксама «Моладзь анлайн: лічбавае асяроддзе будучага».

Таксама ў гэты дзень пройдуць сумесныя пасяджэнні кіруючых органаў Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі і Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і пасяджэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва гандлёва-прамысловых палат Расіі і Беларусі.

У наступныя два дні форуму, 30 чэрвеня і 1 ліпеня, мерапрыемствы пройдуць на пляцоўцы Дома ўрада Маскоўскай вобласці.

У прыватнасці, 30 чэрвеня віцэ-спікеры Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі — Анатолій Ісачанка і Юрый Вараб'ёў — правядуць пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

Пасля гэтага запланавана сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і яе расійскай калегі Валянціны Мацвіенкі з кіраўнікамі рэгіянальных органаў дзяржаўнай улады Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь.

Завершыць насычаную праграму форуму пленарнае пасяджэнне з удзелам кіраўнікоў органаў дзяржаўнай улады, міністэрстваў і ведамстваў, дзелавых колаў Расіі і Беларусі, якое пройдзе 1 ліпеня.

Чакаецца, што падчас правядзення форуму будзе падпісаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве, кантрактаў паміж прадпрыемствамі дзвюх краін.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 8, 17

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Законы, што прымаюцца, садзейнічаюць упэўненасці ў заўтрашнім дні

Сенатар Віктар Лісковіч правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях

Да старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці звярнуліся заяўнікі па пытанні адэкватнасці аказання медыцынскай дапамогі ў адной з цэнтральных раённых бальніц краіны. На жаль, пацыентка загінула і зварот быў звязаны з ацэнкай медыцынскай дапамогі і правільнасцю праведзеных медперсаналам дзеянняў.

— Мы ўважліва вывучылі сітуацыю, якая склалася, плануем перадаць дадзены зварот у Генеральную пракуратуру, — прывёў журналістам вынікі разгляду складанай сітуацыі сенатар.

Аналізуючы ўсе звароты, што трапляюць у Савет Рэспублікі, Віктар Лісковіч звярнуў увагу на разнароднасць іх гучання: многія носяць як асабісты, прыватны характар, так і датычацца ўсяго грамадства.

— Усе гэтыя звароты мы ўважліва разглядаем і, зыходзячы з гэтага, аналізуем, робім пэўныя высновы, што ў далейшым знаходзіць адлюстраванне ў законапраектах, якія карэкціруюцца і змяняюцца, — падкрэсліў ён.

Сенатар перакананы, што для гэтага не трэба чакаць толькі заявак ад людзей, а неабходна бачыць тэндэнцыі, глядзець на практыку выкарыстання законаў, якія дзейнічаюць, і своечасова ўносіць у іх змяненні, каб любыя негатыўныя моманты, што могуць паўплываць на жыццядзейнасць грамадства, былі своечасова выпраўлены.

Віктар Лісковіч нагадаў, што парламентарыі не так даўно прынялі цэлы шэраг законапраектаў, якія былі неабходныя грамадству для захавання згоды, спакою, справядлівасці і ўпэўненасці ў тым, што ў краіне будуць мір і парадак.

— Я перакананы, што гэтыя законы будуць падмацоўваць упэўненасць нашых людзей у заўтрашнім дні, — падкрэсліў ён.

Сенатар акцэнтаваў увагу, што сёння шмат станоўчых прыкладаў, якія сведчаць аб далейшым паступальным і стваральным развіцці краіны, яе эканомікі:

— Цяпер ідуць плановыя працэсы ў грамадстве, і гэтаму пацвярджэнне — уступная кампанія, якая распачалася, — нагадаў ён. — Дзеці паспяхова скончылі школу, з серады пачалі здаваць уступныя іспыты. Найлепшыя выпускнікі стануць студэнтамі, а ў далейшым — будуць запатрабаваныя ў грамадстве ў якасці спецыялістаў сваёй справы.

Акрамя таго, прыгадаў старшыня прафільнай камісіі, працягваецца летняя аздараўленчая кампанія для школьнікаў. І для іх створаны ўсе ўмовы.

— Такія прыклады ёсць па розных кірунках: праводзіцца шмат культурных, спартыўных мерапрыемстваў. Усё гэта сведчыць аб тым, што мы не стаім на месцы, а жывём паўнавартасным жыццём, мы ведаем, чаго хочам, што нам рабіць, і ўпэўненыя ў заўтрашнім дні, — рэзюмаваў ён.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

АДНОСІНЫ ЎСЕБАКОВАГА СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом КНР у Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮНАМ.

Фота БелТА.

Вітаючы госця, спікер верхняй палаты беларускага парламента акцэнтавала ўвагу на тым, што адносіны абедзвюх краін выбудоўваюцца на ўзроўні высокага даверу і павагі да інтарэсаў адзін аднаго.

— Трывалым падмуркам нашых узаемаадносін з'яўляюцца і асабістыя сяброўскія адносіны лідараў нашых краін, — падкрэсліла яна. — І сёння мы можам дакладна сказаць, што нашы адносіны выйшлі на ўзровень усебаковага стратэгічнага партнёрства, а гэта вельмі высокі ўзровень даверу.

Ва ўмовах санкцыйнай палітыкі Захаду вельмі важнымі цяпер з'яўляюцца гандлёва-эканамічныя адносіны, звярнула ўвагу старшыня Савета Рэспублікі:

— Мы разумеем, што нам трэба як ніколі ўзмацніць наша гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. І мы рады таму, што сёлета тавараабарот вырас на 28 %, гэта вельмі важна для нашых краін, — перакананая яна.

Наталля Качанава нагадала, што нашы краіны рэалізоўваюць выдатныя сумесныя праекты, у прыватнасці, «Вялікі камень», і не так даўно беларускі лідар падпісаў адпаведны указ, які дасць магчымасць прыцягваць у парк новых рэзідэнтаў і інвестараў.

На думку спікера верхняй палаты парламента, вялікае значэнне мае і рэгіянальнае супрацоўніцтва паміж гарадамі, абласцямі і правінцыямі дзвюх краін. Наталля Качанава запэўніла суразмоўніка, што беларускія сенатары гатовыя садзейнічаць развіццю рэгіянальнага супрацоўніцтва і рэалізацыі прапаноў кітайскага боку.

Асобна спынілася Наталля Качанава на ўзроўні адносін у сферы аховы здароўя, і ў якасці прыкладу прывяла гуманітарную дапамогу Кітая нашай краіне, якую тая аказала ў сувязі з пандэміяй COVID-19:

— Мы шчыра ўдзячныя кітайскім калегам, народу і кіраўніку Кітая за дапамогу і падтрымку, якую вы нам аказалі, калі летась бяда прыйшла і ў нашу краіну, і якую аказваеце цяпер. Гэта і медыцынскае абсталяванне, і сродкі індывідуальнай аховы, і лекі, і вакцына, — падзякавала яна.

У завяршэнне старшыня Савета Рэспублікі запэўніла, што Кітай для Беларусі — гэта дружалюбная, родная краіна і беларускі бок гатовы да супрацоўніцтва па ўсіх напрамках.

У сваю чаргу, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн расказаў, што за паўгода работы ў Беларусі перакануўся, як сітуацыя ў Беларусі становіцца лепшай.

— Мы звярнулі ўвагу, што ваша палітычная, сацыяльная і эканамічная абстаноўка бесперапынна паляпшаецца і стабілізуецца, — падкрэсліў ён і адзначыў, што дзякуючы правядзенню Усебеларускага народнага сходу адбылася мабілізацыя грамадства на тое, каб аб'яднаць краіну для далейшага яе развіцця.

Дыпламат таксама звярнуў увагу на сур'ёзныя зрухі ў эканоміцы:

— Нягледзячы на няпросты час (а эпідэмічная сітуацыя ўсё яшчэ сур'ёзна ўплывае на свет), ваша эканоміка атрымала нядрэннае развіццё. За сёлетнія першыя пяць месяцаў ваша эканоміка займела прырост у 3,1 %. Такі прырост у агульнасусветным пасіўным развіцці вельмі каштоўны, — перакананы дыпламат.

Працягваючы тэму парламенцкай дыпламатыі, Се Сяаюн падкрэсліў, што лічыць дастойнай і эфектыўнай дзейнасць спікера верхняй палаты беларускага парламента ў справе развіцця двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі:

— Вы з'яўляецеся сябрам кітайскага народа, таму я вас вельмі паважаю. І, карыстаючыся выпадкам, хацеў бы перадаць прывітанне ад старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Кітая Лі Чжаньшу.

У канцы сустрэчы кітайскі пасол адзначыў, што кітайска-беларускія адносіны знаходзяцца на вельмі высокім узроўні свайго развіцця.

— Усебаковыя, даверлівыя, стратэгічныя напрамкі супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю атрымліваюць стабільнае і плённае развіццё ў апошнія гады. І перш за ўсё дзякуючы рабоце кіраўніцтва і асабістаму клопату лідараў дзвюх краін. Наш палітычны ўзаемны давер умацоўваецца, — рэзюмаваў ён.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ПАРЛАМЕНЦКАЕ ВЫМЯРЭННЕ ІНТЭГРАЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7–й стар.)

Знакавай падзеяй стала сумесная выстаўка прамысловай прадукцыі. Галоўнымі яе тэмамі былі імпартазамяшчэнне і беларуска-расійская прамысловая кааперацыя.

На ёй быў падпісаны пакет пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай і іншых сферах. Сярод падпісантаў, напрыклад, Рэспубліка Комі і Гродзенская вобласць, Іванаўская і Віцебская, Арэнбургская і Гомельская вобласці ды іншыя пары рэгіёнаў. А Беларусбанк і Расэксімбанк заключылі генеральнае пагадненне.

Праграма трэцяга форуму, які зноў прайшоў у Мінску, таксама была накіравана на садзейнічанне развіццю міжрэгіянальнага навуковага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Чацвёрты форум (у Маскве) прысвяцілі тэме інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў у сферы высокіх тэхналогій, інавацый і інфармацыйнага грамадства. У сямі секцыях ішла зацікаўленая размова аб стымуляванні канкурэнтаздольных высокатэхналагічных вытворчасцяў, сумеснай рабоце расійскіх і беларускіх IT-кампаній на рынках Саюзнай дзяржавы і ў трэціх краінах. Тады прагучала думка аб неабходнасці больш рашучага пераходу ад рэгіянальных кантактаў да супрацоўніцтва гарадоў і раёнаў, дыверсіфікацыі ўзаемнага гандлю.

Праз прызму інтэграцыі

Пяты форум (у Магілёве) у кастрычніку 2018 года вызначыў прыярытэтныя напрамкі развіцця рэгіянальнага супрацоўніцтва як ключавога фактару інтэграцыі і саюзнага будаўніцтва. Секцыі прайшлі па пяці асноўных тэмах: аграрная палітыка, уніфікацыя і гарманізацыя заканадаўстваў, лічбавая эканоміка, маладзёжная палітыка, міжнародная дзейнасць і эканамічная бяспека.

Форум выклікаў цікавасць у кіраўнікоў суб'ектаў Расіі — адтуль прыехала больш чым 20 губернатараў: Маскоўскай, Бранскай, Самарскай, Арэнбургскай, Кіраўскай, Растоўскай, Варонежскай, Ліпецкай, Валагодскай, Смаленскай, Курскай абласцей, Рэспублікі Алтай, Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі, Карачаева-Чаркесіі і іншых. Заяўкі на ўдзел у форуме падалі таксама 17 кіраўнікоў прадстаўнічых органаў улады расійскіх рэгіёнаў.

Упершыню на форуме прайшоў Савет дзелавога супрацоўніцтва, дзе асноўныя кірункі ўзаемадзеяння і сумесныя праекты абмеркавалі кіраўнікі кампаній і прадпрыемстваў Беларусі і Расіі. У выніку было падпісана больш за 70 пагадненняў аб супрацоўніцтве на міжурадавым, абласным і раённым узроўнях. Агульная сума заключаных кантрактаў склала больш за 500 мільёнаў долараў.

Нагадаем, на той час з пачатку правядзення форумаў было заключана камерцыйных кантрактаў і пагадненняў на 930 мільёнаў долараў. Напрыклад, па выніках III Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі такіх дакументаў падпісалі на 300 мільёнаў долараў, а па выніках IV Форуму — звыш 400 мільёнаў долараў. І далей па ўзрастаючай.

Не аб адным хлебе

VI Форум прымаў Санкт-Пецярбург. Зразумела, былі падпісаны ўзаемавыгадныя пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, камерцыйныя кантракты, іншыя дакументы аб партнёрстве. Але на гэтым форуме прапанавалі паглядзець на міжрэгіянальныя сувязі як на інструмент фарміравання адзінай культурнай і гуманітарнай прасторы народаў Беларусі і Расіі.

Разгарнулася дыскусія вакол рэалізацыі сумесных маладзёжных праектаў, аб шляхах узаемадзеяння рэгіёнаў у стварэнні агульнай інфармацыйнай прасторы ў мэтах развіцця культурных і гуманітарных сувязяў Саюзнай дзяржавы. А ў паскораным ажыццяўленні культурна-гуманітарных праектаў убачылі важны прыярытэт для збліжэння народаў Беларусі і Расіі. Турызм сталі разглядаць як драйвер эканамічнага росту і культурнага развіцця рэгіёнаў.

Леташні VII Форум у Мінску і Мінскай вобласці займае асаблівае месца ў практыцы іх правядзення. Тэма Вялікай Перамогі, яе гістарычная спадчына як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі, вядома, былі абраны невыпадкова. Гістарычная памяць аб гераічнай перамозе савецкага народа мае выключнае значэнне для фарміравання і ўмацавання грамадзянскай самасвядомасці (грамадзянскай ідэнтычнасці) народаў Беларусі і Расіі, паступальнага сацыяльнага і эканамічнага развіцця Саюзнай дзяржавы, а таксама ў барацьбе са спробамі фальсіфікацыі асобнымі замежнымі аналітыкамі прычын і наступстваў Другой сусветнай вайны, перагляду яе вынікаў і прыніжэння выключнай ролі СССР у разгроме нацысцкай Германіі.

З гэтай нагоды ўдзельнікі форуму выказалі шэраг слушных рэкамендацый, у прыватнасці па процідзеянні гераізацыі нацызму, выхаванні ў моладзі патрыятызму і грамадзянскай адказнасці, павагі да гістарычнай спадчыны і падзвігу савецкіх людзей.

Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.

Сядзі і глядзі

НОВЫ ВЯДУЧЫ НА «ПІН_КОДЗЕ»?

Імя пераможцы рэаліці-адбору, які ладзілі ў рамках маладзёжнага праекта «ПІН_КОД» на тэлеканале «Беларусь 2», ужо сёння, 18 чэрвеня, вызначаць у прамым эфіры.

На працягу трох апошніх месяцаў смелыя і цікаўныя школьнікі і студэнты змагаліся на вачах у гледачоў у творчай барацьбе за месца новага вядучага праграмы, што дазволіла ім прайсці сапраўдную тэлевізійную школу і спазнаць закуліссе стварэння праекта. Яны кожны дзень слухалі лекцыі ад вопытнай каманды «пінкодаўцаў», старанна выконвалі прапанаваныя практыкаванні, вучыліся працаваць у кадры, а таксама самастойна рыхтавацца да прамых эфіраў і ствараць якасныя відэасюжэты.

— Да фіналу дайшлі трое ўдзельнікаў: Ілона Камаска, Данііл Карабан і Таццяна Луханіна. Зараз прэтэндэнты на ролю вядучага выконваюць заключнае заданне: здымаюць тэлевізійныя сюжэты на пэўную тэму. А ацэняць іх работы нашы тэлегледачы, а таксама каманда праекта і кіраўніцтва тэлеканала, — адзначыў кіраўнік праекта «ПІН_КОД» Ягор Шолькін.

Па выніках галасавання адзін з фіналістаў атрымае магчымасць стаць пастаянным вядучым праграмы. Варта адзначыць, што заданне разам з удзельнікамі адбору выконвалі і дзеючыя вядучыя праекта «ПІН_КОД». Навошта? Адказ даведаемся ў эфіры 18 чэрвеня ў 15.45.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 122

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Мікалай Быкаў з вёскі Рэпічы Баранавіцкага раёна ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крa2, Фс1, Ле7, Лf6, Са3, Сh1, Кс6 (7).

Чорныя: Крd5, Фе6, Ле4, Сg8, nb6 (5).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Як мы ўжо паведамлялі, у Мінску прайшлі чэмпіянаты Беларусі сярод мужчын і жанчын (адпаведна 23 і 12 удзельнікаў, якія гулялі па швейцарскай сістэме ў 9 тураў). У мужчынскім турніры сярод іншых змагаліся 5 гросмайстраў, 4 міжнародныя майстры і 4 майстры ФІДЭ, у жаночым — 4 майстры ФІДЭ.

Сярод мужчын доўгі час лідзіравалі маладыя шахматысты, але на фінішы наперад выйшлі больш вопытныя гросмайстры. Чэмпіёнам краіны ўжо не першы раз стаў Кірыл Ступак (7 балаў). На другім месцы — Аляксей Фёдараў (6), на трэцім — малады майстар ФІДЭ Арцём Сіняўскі (таксама 6). Непасрэдна за прызавой тройкай у турнірнай табліцы размясціліся Максім Царук, Дзяніс Лазавік, Ігар Люцко, Мікіта Маёраў і Глеб Галкін — па 5,5. Леташні чэмпіён Беларусі Міхаіл Нікіценка фінішаваў дзявяты.

Кірыл Ступак — Максім Царук. 1. Kf3 Kf6 2. c4 e6 3. g3 d5 4. Cg2 dc 5. Фa4+ c6 6. Ф:c4 b5 7. Фb3 Cb7 8. 0-0 Kbd7 9. d4 Ce7 10. Кc3 0-0 11. Ke5 K:e5 12. de Kd7 13. Cf4 Фb6 14. Лac1 Лac8 15. Лfd1 Лfd8 16. Ke4 Кc5 17. Л:d8+ Л:d8 18. Фb4 a5 19. Фa3 b4 20. Фe3 Kd7 21. Ф:b6 K:b6 22. Ce3 Kd7 23. f4 Kpf8 24. Kpf2 Лc8 25. Kd2 Ca8 26. Kb3 Cd8 27. Kd4 Cb6 28. Kb3 Cd8 29. Лc2 Kpe8 30. Kd4 Cb6 31. Kb5 Kpe7 32. C:b6 K:b6 33. Ka7 Лc7 34. K:c6+ C:c6 35. Л:c6 Л:c6 36. C:c6 Kc4 37. b3 Kd2 38. Kpe3 Kf1+ 39. Kpd4 K:h2 40. Cg2 Kg4 41. e4 f6 42. ef+ gf 43. Cf3 e5+ 44. Kpd3 Kh2 45. Ce2 ef 46. gf f5 47. ef Kpf6 48. Kpe3 Kp:f5 49. Cd3+ Kpg4 50. Kpe4 Kph4 51. Ce2 h5 52. f5 Kpg5 53. Kpe5 Kg4+ 54. C:g4 hg 55. f6 g3 56. f7 g2 57. f8Ф g1Ф 58. Фg7 Kph4 59. Ф:g1, 1:0.

У жаночым першынстве склад быў маладзёжны. Свой поспех 2019 года паўтарыла Аляксандра Тарасенка — 7 балаў. Столькі ж у Яны Ільючык, па дадатковых паказчыках яна другая. «Бронза» — у Варвары Паляковай. Леташняя чэмпіёнка Ксенія Зелянцова сёлета на пятым месцы.

Наталля Мельнікава — Аляксандра Тарасенка. 1. c4 f5 2. Kf3 g6 3. Kc3 Cg7 4. d4 d6 5. Cf4 Kf6 6. Фd2 0-0 7. h4 Kc6 8. Ch6 a6 9. C:g7 Kp:g7 10. h5 K:h5 11. Kd5 e6 12. Kf4 K:f4 13. Ф:f4 h5 14. Лh3 Фf6 15. a3 e5 16. de de 17. Фg5 e4 18. Ф:f6+ Kp:f6 19. Kd2 Ce6 20. Лc3 Лad8 21. Лd1 Ke5 22. f4 ef3 23. ef3 Лfe8 24. Ce2 c5 25. Kb3 b6 26. Л:d8 Л:d8 27. Kc1 28. b3 g5 29. f4 Л:f4 30. C:h5 g4 31. Kd3 Le4+ 32. Kpf2 Kpg5 33. Ce8 g3+ 34. Kpf1 Le3 35. K:c5 Л:c3 36. K:e6+ Kpg4 37. Kc7 Le3 38. Kd5 Л:b3, 0:1.

* * *

У Магілёве адбыўся XX шахматны фестываль на прызы гросмайстра Аляксея Фёдарава. У бліц-турніры (46 удзельнікаў) тройку прызёраў склалі Цімур Гваздзёў, Вольга Бадзэлька і Ягор Сіліч, у турніры дзяцей 2006—2008 гадоў нараджэння (39 гульцоў) — Ягор Сіліч, Аляксей Грыгаровіч і Іван Кірпічоў, а турнір шахматыстаў 2009 г. н. і маладзейшых (53 удзельнікі) выйграў Арцём Шыдлоўскі.

Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

У сераду, 16 чэрвеня, у рэжыме відэаканферэнцыі адбылося пасяджэнне 60-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, у якім узялі ўдзел члены Савета Рэспублікі з саставу дэпутацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкім сходзе — Віктар Ананіч, Валерый Гайдукевіч, Ірына Ляўковіч, Міхаіл Русы, Віктар Чайчыц, Андрэй Шышкін і Анатоль Шчасны.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, на парадку дня знаходзілася дзевяць пытанняў, ключавыя з якіх былі звязаныя з бюджэтным працэсам.

У прыватнасці, разгледжаны ход падрыхтоўкі праекта бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2022 год, справаздача Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб выкананні бюджэту Саюзнай дзяржавы за 2020 год.

Саюзныя парламентарыі разгледзелі таксама праект Дэкрэта Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2020 год».

Акрамя таго, дэпутаты падвялі вынікі леташняй дзейнасці Парламенцкага сходу, абмеркавалі магчымасць распаўсюджвання дзеяння полісаў абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў, выдадзеных у Беларусі ці Расіі, на ўсю тэрыторыю Саюзнай дзяржавы.

У рамках пасяджэння таксама прайшла дыскусія аб магчымасці выкарыстання мадэльнай заканатворчасці ў Парламенцкім сходзе.

Аўтар матэрыялаў паласы Вольга АНУФРЫЕВА.

Даніна памяці

Па ініцыятыве Маладзёжнага савета (парламента) у Мінску была абноўлена мемарыяльная дошка Сяргею Прытыцкаму

Новая мемарыяльная дошка ў гонар выдатнага дзяржаўнага дзеяча БССР, арганізатара камсамольскага падполля Заходняй Беларусі з'явілася напярэдадні 50-годдзя з дня яго смерці.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, Маладзёжны савет выступіў з ініцыятывай замены пашкоджанай часам мемарыяльнай дошкі, якая была замацавана на жылым доме № 32 па вуліцы Прытыцкага. Асоба арганізатара камсамольскага падполля і яго ўклад ва ўз'яднанне Заходняй Беларусі і БССР унікальныя, адзначыў **старшыня Маладзёжнага парламента Ягор МАКАРЭВІЧ.**

— Нам важна захаваць і перадаць памяць аб сапраўдных героях нашай краіны, людзях, дзякуючы якім сёння беларускі народ адзіны. І ў Год народнага адзінства гэтае мерапрыемства асабліва сімвалічнае, — падкрэсліў ён.

БУДЗЬ У КУРСЕ!

На «Славянскі базар» — без аплаты

На тэрыторыі Брэсцкай вобласці з 1 ліпеня ўведзены мясцовы збор за перасячэнне транспартнымі сродкамі Дзяржаўнай граніцы Беларусі ў пунктах пропуску.

Гэта прадугледжана рашэннем Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў ад 24 мая 2021 года № 247, якое ўчора афіцыйна было апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Стаўка збору за перасячэнне граніцы ўстаноўлена ў памеры 1 базавай велічыні за адзін транспартны сродак незалежна ад колькасці пасажыраў.

Ад выплаты збору вызваленыя транспартныя сродкі, на якіх едуць: асобы, што выязджаюць пасля пахавання ў Беларусі членаў сям'і і блізкіх сваякоў, пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў; замежныя грамадзяне, якія выязджаюць пасля знаходжання на санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні ў санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях Беларусі, пры наяўнасці пацвярджаючых дакументаў; замежнікі і асобы без грамадзянства, якія накіроўваюцца па дакументах, што пацвярджаюць ступень цяжару і выяўленасці цяжкасцяў фізічнай актыўнасці і ўдзелу 75-100 %, выдадзеных кампетэнтнымі органамі дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці альбо звычайнага месца жыхарства замежнага грамадзяніна або асобы без грамадзянства; замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія выязджаюць з Беларусі па пастановах (рашэннях) кампетэнтных органаў аб дэпартацыі (высылцы).

Акрамя таго, вызвалены ад выплаты збору замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, для якіх устаноўлены бязвізавы парадак уезду ў нашу краіну і выезду з яе ў сувязі з правядзеннем Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пры наяўнасці арыгінальных або электронных білетаў на мерапрыемствы фестывалю ў Летнім амфітэатры альбо канцэртнай зале «Віцебск».

Дадзенае рашэнне дзейнічае да 1 студзеня 2023 года.

ФАРБЫ ПРЫРОДЫ І ДУШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Тым не менш маляўнічых мясцін, дзе можна глынуць свежага паветра, у Мінску шмат. Напрыклад, тыя ж экалагічныя сцяжынкі. Яны пракладзены ў кожным раёне сталіцы, і іх колькасць пастаянна расце. Ствараюцца экасцяжынкі выключна там, дзе шмат зеляніны, птушак і чыстага паветра, упрыгожваюцца малымі архітэктурнымі формамі.

Парэкамендуем прайсці пешы маршрут уздоўж берага Чыжоўскага вадасховішча ў Заводскім раёне. У Фрунзенскім — адпачыць у парку «Дзівівелка». У Першамайскім — у Севастопальскім парку. У Партызанскім — азнаёміцца з краявідамі Сляпянскай воднай сістэмы, у Маскоўскім — прайсціся ўздоўж ракі Мышкі. У Цэнтральным — прагуляцца па беразе Свіслачы за РНПЦ «Маці і дзіця».

У мінулую пятніцу на Цнянскім вадасховішчы прайшла ўрачыстая цырымонія адкрыцця экасцяжынкі Савецкага раёна — дакладней, яе здача ў эксплуатацыю гараджанам пасля грунтоўнай дапрацоўкі. Дзякуючы сумесным намаганням шэрагу раённых арганізацый пабабапал сцежкі ў кожнай тэматычнай зоне з'явіліся альтанкі, лаўкі і масткі, фігуры і інсталяцыі, а таксама інфармацыйныя стэнды.

Скажаце, што пешыя вандроўкі — гэта несучасна, што куды больш магчымасцяў для ўражанняў пакідае ровар — і пазнавальна, і экалагічна, і фізічная нагрузка выдатная! Невыпадкова апошнім часам у Мінску становіцца ўсё больш аматараў веласіпедных прагулак і падарожжаў. З гэтай мэтай на дарогах ствараюцца спецыяльныя палосы руху для веласіпедаў, іншыя зручнасці. Нядаўна паўстала пытанне аб аб'яднанні веладарожак (іх агульная працягласць — прыкладна 250 кіламетраў) у адзіную сетку. Дарэчы, гэту ідэю мясцовым уладам горада, а менавіта старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміру Кухараву «падкінулі» падчас прамой тэлефоннай лініі самі веласіпедысты. Цяпер ідзе работа над ажыццяўленнем прапановы.

І не толькі гэтай. Як вядома, сучасныя ровары даволі хуткія, іх уладальнікі пры перасячэнні дарог нярэдка ствараюць аварыйныя сітуацыі. Таму вельмі важна зрабіць рух на веладарожках бяспечным. З гэтай нагоды мясцовая ўлада горада даручыла ўважліва іх агледзець і там, дзе ёсць патрэба, правесці бягучы рамонт, па магчымасці зрабіць паніжэнне каменных бардзюраў на пешаходных пераходах і г. д. Дарэчы, сёння ў горадзе да паслуг веласіпедыстаў — як магістральная 27-кіламетровая дарожка, так і менш працяглыя, напрыклад, у парках 900-годдзя Мінска і «Цівалі».

Зразумела, для многіх мінчан, асабліва маладых, найлепшы адпачынак у спякотны дзень — каля вады і пажадана на добраўпарадкаваным пляжы. Іх у сталіцы і яе наваколлях дастаткова. Яшчэ да 15 мая, калі звычайна адкрываецца купальны сезон, усе 20 афіцыйных, так бы мовіць, пляжаў былі прыведзены ў парадак. Што зроблена? Як і заўсёды, прыбралі тэрыторыю, паставілі ўрны і скрыні для смецця, адрамантавалі і пафарбавалі кабіны для пераадзявання, «грыбкі» для аховы ад сонца і г. д. Сёлета стала больш альтанак і цывілізаваных месцаў з мангаламі. Гэтыя зоны барбекю папулярныя ў прыхільнікаў пікнікоў на свежым паветры.

> У гарадской практыцы арганізацыі летняга адпачынку сёлета цікавае наваўвядзенне: пляж № 9 Заслаўскага вадасховішча гарадскія ўлады вырашылі прыстасаваць для адпачынку людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Тут сапраўдная інклюзія: спецыяльныя насціл і пантон дазваляюць на інваліднай калясцы пад'ехаць непасрэдна да вады, а затым і зайсці ў яе.

Важная прыкмета сённяшніх пляжаў — варкаўт-пляцоўкі для заняткаў фізічнай культурай, пункты пракату спартыўнага інвентару, шэзлонгаў і іншага.

Сёння на беразе некаторых вадасховішчаў, такіх як Цнянскае, Дразды, Крыніца, Заслаўскае, можна больш камфортна адпачываць дзякуючы стацыянарным шэзлонгам, новым альтанкам, сталам для настольнага тэніса, пракату электрычных самакатаў, устаноўцы біятуалетаў.

У гарадской практыцы арганізацыі летняга адпачынку сёлета цікавае наваўвядзенне: пляж № 9 Заслаўскага вадасховішча гарадскія ўлады вырашылі прыстасаваць для адпачынку людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Тут сапраўдная інклюзія: спецыяльныя насціл і пантон дазваляюць на інваліднай калясцы пад'ехаць непасрэдна да вады, а затым і зайсці ў яе. Ёсць на пляжы спецыяльная кабінка для пераадзявання калясачнікаў і выраблены з улікам іх патрэб спецыяльная пляжная мэбля, трэнажоры.

Для аматараў гарачай пары таксама добрая навіна: у чэрвені адкрываецца пасля даволі працяглай рэканструкцыі славутая лазня № 1, якую ўзвялі яшчэ ў 1954 годзе. Цяпер яе не пазнаць: у прыгожым трохпавярховым будынку па вул. Б. Хмяльніцкага, што побач з праспектам Незалежнасці, прадугледжаны і нумары «люкс» з джакузі, з міні-басейнам, маленькім вадаспадам і гідрамасажорам. Для наведвальнікаў агульнага аддзялення даступныя вялікі басейн памерамі 17 м на 7 м, іншыя выгоды. Гэта ўжо не проста лазня, а сапраўды аздараўленчы комплекс.

Ну а тым, хто, акрамя сустрэч з гарадской прыродай, не супраць яшчэ і пазнаёміцца з высокім мастацтвам на мінскіх вуліцах, можна параіць наведаць выстаўку «Мастак і горад». Яна адкрылася ў дзясяты раз — 27 мая па вуліцы Камсамольскай. Раней экспазіцыю разгортвалі на плошчы Якуба Коласа побач з помнікам класіку. І кожны раз выстаўку прысвячалі творчасці кагонебудзь з нашых вядомых мастакоў.

Сёлета ў экспазіцыі прадстаўлены 34 якасныя рэпрадукцыі твораў народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва з тэкстамі на беларускай, рускай і англійскай мовах. Называецца яна «Фарбы душы. Леанід Шчамялёў». Працягнецца выстаўка да 20 верасня. Між іншым, у свой час праз такія выстаўкі «прайшоў» шэраг знакамітых мастакоў: Марк Шагал, Мікалай Селяшчук, Зоя Літвінава, Казімір Малевіч і іншыя.

Што яшчэ можна параіць для душы? У Мінску пачаўся летні музычна-турыстычны сезон. З 22 мая і да сярэдзіны верасня ў Верхнім горадзе кожныя выхадныя будуць ладзіцца разнастайныя імпрэзы: канцэрты, танцавальныя праграмы, выступленні маладзёжных і дзіцячых творчых калектываў, майстар-класы, кінапаказы і г. д. Напрыклад, прадоўжыцца праект «Класіка каля ратушы», адбудуцца святы нацыянальных культур Расіі і Малдовы. Падрабязнасці праграмы сезона можна даведацца на сайце Мінгарвыканкама.

Неабходна сказаць, што яшчэ загадзя, да пачатку чэрвеня, мясцовыя ўлады сталіцы, у тым ліку і дэпутаты Мінскага гарадскога Савета, шмат увагі аддавалі арганізацыі адпачынку гараджан у летні сезон. У прыватнасці, на чарговай сесіі гарсавета зацвердзілі план па добраўпарадкаванні і азеляненні сталіцы. Яго выкананне знаходзіцца на кантролі дэпутатаў. У выпадку неабходнасці дэпутаты гарадскога Савета, па словах яго старшыні Андрэя Бугрова, могуць дафінансаваць рэалізацыю таго ці іншага праекта. Бо стварэнне камфортных умоў пражывання і адпачынку мінчан — безумоўны прыярытэт.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2021 года.**

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ
«ЗВЯЗДЫ»
АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

ДРЭННА ЧАЛАВЕКУ, КАЛІ ЁН АДЗІН...

Якіх толькі святаў цяпер няма! Не так даўно, дзявятага чэрвеня, дзень сяброў адзначаўся. Нават міжнародны...

Чым не нагода, каб успомніць сваіх, каб падзякаваць за тое, што яны ў нас былі і ёсць, бо знайсці...

Для многіх маіх знаёмых гэта праблемай не стала: змалку выйшлі ў двор ці на вясковую вуліцу, пахадзілі ў садок альбо школу, паслужылі ў войску, і ўсё — дружба завязалася...

Я вось гэтым пахваліцца не магу: прыяцелькі, нават блізкія, у мяне заўсёды былі, а вось пра сапраўдных сяброў... Я пра іх толькі марыла, пакуль неяк...

Нас, настаўнікаў хіміі і біялогіі, запрасілі тады ў сталіцу на семінар. На ім на працягу тыдня мы слухалі розных выступоўцаў, дзяліліся вопытам, разам думалі, як лепей вучыць, выхоўваць ды развіваць дзяцей.

У час гэтых заняткаў поплеч са мной сядзела каляжанка з Мінска. У першы ж дзень мы з ёй пазнаёміліся, разгаварыліся, і я адразу ж, здаецца, убачыла, як многа ў нас агульнага! Мы абедзве, у залежнасці ад падбору дзяцей у класе, прымянялі свае, асабістыя метады выкладання, праводзілі розныя мерапрыемствы, чыталі адны і тыя ж кнігі, любілі кіно, тэатр... Мы нават туды схадзілі ў адзін з вечароў!..

Тыдзень праляцеў як адна мінута! Мне трэба было ад'язджаць. Галя, што мяне зусім не здзівіла, захацела праводзіць.

І вось мы з ёй стаім на пероне. Да адпраўкі цягніка застаюцца лічаныя хвіліны. «Трэба ж абмяняцца адрасамі!» — кажу я, бо тэлефона дома не мела... Спешна шукаю, на чым бы запісаць і яе, і свой, а заадно ўголас шкадую, што даводзіцца расставацца. А як жа, маўляў, добра было б жыць побач, працаваць разам, у адной нейкай школе!.. «Мы б столькі, — кажу, — усяго прыдумалі!.. І так сябравалі б!» — «Што?.. Сябравалі? — перапытала ў мяне Галіна. — Ды ніколі ў жыцці! Не будзь наіўнай: калі б мы разам працавалі, я цябе зненавідзела б!» — «Але за што?» — зусім разгубілася я. — «Не цярплю саперніц... Ні ў чым», — адрэзала каляжанка і, пажадаўшы ўдачы і задраўшы галаву, падалася прэч.

...Пасля гэтага прайшлі — ды што там, — праляцелі гады. Разам з імі прыйшлі тыя самыя ўдачы і поспехі, знайшлося шчасце ў жыцці — у сям'і, у любімых вучнях.

З'явілася ў мяне і сапраўдная сяброўка — супрацоўніца, каляжанка.

Шкада, што цяпер яна далекавата ад мяне, але ж сувязь добрая, так што мы па-ранейшаму разам.

А пра Галю я нічога, на жаль, не ведаю: газеты пра яе, здаецца, не пісалі, тэлевізар не паказваў. Дрэнна чалавеку, калі ён адзін...

Зоя Наваенка,
Глыбоцкі раён.

«МАЯ НЕ ТАКАЯ...» І ДЗЯКУЙ БОГУ!

Мне было 11, калі мама яшчэ раз выйшла замуж і 13 — калі нарадзіла сястру. Бацькі ёй доўга выбіралі імя, аднак я да яго так і не прывыкла. Для мяне, і гэта, відаць, назаўсёды, сястра засталася проста малой, хоць і вышэйшай ростам... Абагнала ў дзявятым класе і, здаецца, тады ж без памяці закахалася.

Франак быў трохі старэйшы за яе, збіраўся ў войска. Малая абяцала яго чакаць, ледзь не кожны дзень пісала лісты і нікуды ні з кім не хадзіла. Мы нават баяліся за яе, казалі: «Ну добра, як адслужыць ды замуж пакліча, а як раптам адвернецца?.. Звар'яцее ж дзеўка!».

Да гэтага, дзякуй богу, не дайшло, хоць...

Калі па парадку, праз два гады наш салдацік прыехаў (шчасце не мела межаў!), уладкаваўся працаваць на трактарны завод, засяліўся ў інтэрнат, бачым — памалу прыадзеўся... «Нам трэба ўсур'ёз пагаварыць, але не зараз», — сказаў аднойчы малой, а яна ўжо — мне, па сакрэце.

Разам з ёй мы чакалі — ну, вядома ж, чаго — прапановы рукі і сэрца. А калі дачакаліся, малая — не паверыце — тыдзень не прасыхала ад слёз, бо яе жаніх у час той сур'ёзнай размовы, неспадзеўкі выдаў, што не можа, не ўмее і не будзе жыць у горадзе, што ён ужо... звольніўся з завода, што ў вёсцы яму абяцаюць іншую работу і, як толькі ажэніцца, — новы дом... А таму, калі малая не супраць...

«Уяўляеш, з Мінска я паеду ў нейкую вёску?! У цьмутаракань? — плакала малая. — Навошта? І што там рабіць?!»

Мы, усёй сям'ёй, як маглі, суцяшалі. Казалі галоўнае: што хлопец кахае, а значыць, нідзе не дзенецца — вернецца ў горад.

Сястра яшчэ раз стала чакаць, але глядзець на гэта было немагчыма. І неяк я не вытрымала, сказала: «Слухай, а што мы губляем? Давай пад'едзем у тую вёску і самі на ўсё паглядзім. Карона ж з цябе не зваліцца?»

...Не буду пісаць, як жа рады быў хлопец нашаму прыезду! Як замітусіліся, забегалі яго бацькі: проста не ведалі, дзе пасадзіць і чым пачаставаць!.. А да ўсяго да гэтага — на дварэ было лета, кветкі, птушкі, прастор...

Мы добра з'ездзілі. Малая дык іншым чалавекам вярнулася, бо ад Франкавай бабулі пачула, што з каханым і на Салаўках пражывеш, а з нялюбым і палац не ўратуе».

У тую ж восень мы згулялі вяселле, і цяпер у нашай малой свой дом, двое дзяцей, гаспадарка — усё, як у сапраўдных вясковых людзей...

Гэта быў уступ да гісторыі. Зараз яна сама.

Летась Франак сабраўся мяняць машыну. Каб дабавіць грошай на лепшую, падгадаваў двух цялят. Разам з братам завезлі мяса на Камароўку ў Мінску і прадалі. Гэту ўдачу трэ было замачыць. Гаспадар натапіў лазню, гаспадыня сабрала на стол.

Мужчыны сядзелі доўга: успаміналі сваю паездку, гандаль... Да малой (яна спаць пайшла) даляталі хіба абрыўкі размоў. «Мая не такая», — час ад часу казаў Франак. «А мая і зусім...» — падтакваў брат. «Яны што — пра нас, сваіх жонак?» — навастрыла вушы гаспадыня і шмат што пачула! Да таго ж раніцой учыніла сапраўдны допыт. У выніку «пазлы» склаліся так.

На рынку да гэтых двух сімпатычных прадаўцоў падышла ну вельмі прыгожая жанчына — даслоўна — «проста Брыджыт Бардо»!

Далей ішлі падрабязнасці:

— Валасоў — цэлая капа! — гаварыў Франак. — Ды бялявыя, доўгія...

(У малой і праўда — зусім не такія!)

— Вусны — як спелыя клубніцы, — «падпяваў» яму брат Рыгор. — Так, здаецца б, і з'еў бы!

Мужчыны, мяркуючы па гуках з кухні, налілі і выпілі, нейкі час памаўчалі і зноў «вярнуліся» да Брыджыт.

— А грудзі ў яе ты бачыў? І на добры літр. Па дзіцячым вядзерцы будуць, — ціха згадваў Рыгор.

— Ды болей, відаць.

— І талія, што ў асы.

— У маёй не такая цяпер, — шкадаваў Рыгор.

— І ў маёй, — згаджаўся з ім брат.

— А да родаў такія фігуркі былі!..

— Выходзіць, гэта мы сапсавалі?.. І правільна зрабілі! Давай за нашых дзяцей!

— І за жонак, бо што б мы без іх?..

— Кароў — дакладна б адны не трымалі, цялят — не прадавалі, тую харашуху жыўцом не ўбачылі...

— Яна — ты помніш? — мяса ў нас узважыла, адлажыла і далей пайшла. Ты казаў, што, мусіць, не вернецца — у некага іншага купіць. А тая, бачу, ідзе — з нейкай сваёй знаёмай. І каля нас спыняюцца.

— Мы адразу ж пакет на вагі. А яны, як выглядае, нікуды не спяшаюцца: стаяць сабе, размаўляюць. Ты чуў, пра што? — папытаўся Франак.

— Не... Я за таварам сачыў.

— А я дык паслухаў.

— І што?

— Ды нічога такога... Тая харашуха расказвала, чаго і пачым накупляла, потым — што на дачы грады пасадзіла — буракі там, капусту... Прыяцелька, чую, «аж у асадак выпала»: як так — у цябе ж там толькі газон ды ружы раслі? А яна ў адказ, што кветак жа не з'ясі, што ў мужа пасада, што ён дзень пры дні ў высокім кабінеце сядзіць. Адпаведна, руху ў яго — ніякага... І ўвесь час — то запор, то гемарой... «Заманалася», кажа, гародніну з рынку цягаць!

— Вось ты падумай, — працягваў Франак, — твая сказала б каму пра твае хваробы?

— Пра гемарой? Ты што?! Яна ж не дурная!

— І мая не сказала б! А вось гэта — на ўвесь базар!

...Звычайна, калі мужчыны заседжваліся за чаркай, малая разганяла іх. На гэты раз не чапала. Казала: паслухала, у падушку пасмяялася і моцна заснула.

Таццяна Гайко,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР

АД ЯЕ Ж і, прабачце, яшчэ раз: гісторый у пошце то густа, то пуста, і ўсе яны розныя. Адны, бывае, адразу просяцца... у архіў, другія — на старонкі газеты, часта — што зразумела, з нейкімі праўкамі, з перакладам з рускай ці казённа-бюракратычнай, як правіла — з неабходнымі скарачэннямі...

Апошняя гісторыя Таццяны Гайко, відаць, выключэнне? Але ж чаму б ім не быць?

Так што пішыце! Конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца, журы працуе.

Неасабісты суб'ектыў

КАРОТКІ ВЕК — КАРОТКІ РОЗУМ,

або Жанчынам падабаецца, калі прыгожа

СЯБРОЎЧЫНА публікацыя ў сацыяльных сетках сёння з раніцы павесяліла. Людміла на сваёй старонцы зрабіла пост: «З жалем вымушана паведаміць, што эра нігерыйскіх адвакатаў і мёртвых, але багатых дзядзечак мінула беззваротна. Настала эра кахання...» Да гэтых слоў яна прымацавала выяву пісьма, якое атрымала па электроннай пошце ад нейкага нібыта Фрэнсіса. «Привет, дорогой. Я нашел тебя (цытую на мове арыгінала, каб быў зразумелы ўвесь «цымус»), когда искал женщину, с которой мог бы провести остаток своей жизни, как только уволился с работы. Я скоро выйду на пенсию и ищу серьезную, честную, порядочную и романтическую женщину, чтобы называть ее своей и любить всю оставшуюся жизнь. Мне нужна консервативная женщина. Я был окном в течение многих лет, с тех пор, как моя жена умерла от рака. Мне нужна женщина из вашей страны, потому что: 1. Меня обманули наши собственные женщины. 2. Мне нужно жить за пределами штата. 3. Я не хочу, чтобы Пентагон заманил меня в новый мир войны. Я расскажу вам больше со своей фотографией, когда вы ответите на мое сообщение...»

Вось так — ні больш, ні менш. Я ўжо хацела здзекліва напісаць сяброўцы: «Хапай, пакуль свабодны!», але тут запішчала мая пошта, і на экране высвецілася пісьмо такога самага зместу, толькі адпраўшчыкам значыўся нейкі Робін. Вось сяджу цяпер і думаю: як жа мы з сяброўкай такога зайздроснага кавалера (а можа, і не аднаго) дзяліць будзем...

А калі без жартаў — дык няўжо хтосьці яшчэ ў падобны «развод» верыць? Пасля столькіх публікацый, сюжэтаў, папярэджанняў? Як ні дзіўна — вераць. І я не здзіўлюся, калі ў хуткім часе ў міліцэйскіх зводках з'явяцца пацярпелыя ад махляроў суайчынніцы, якія пералічылі няшчаснаму Фрэнсісу (Роберту, Джону) грошы на дарогу ў невядомую яму Беларусь, а ён так і не прыехаў... Бо як жа было не пашкадаваць няшчаснага ўдаўца, падманутага, які не хоча ваяваць, а хоча спакойнага жыцця. Гэта ж так прыгожа, так рамантычна, як у дамскіх раманах з яркімі вокладкамі ці ў серыялах...

ДЗЯЎЧАТЫ, нас пачалі лавіць на «прыгожа і рамантычна». Ужо не абяцаюць завоблачных працэнтаў ад спадчыны багатага дзядзькі або ад вывезеных з нашай дапамогай з руднікоў Афрыкі брыльянтаў. Нас перасталі лічыць сквапнымі — прагрэс. А вось на «прыгожа» купляемся на раз-два.

Нядаўна ў Мінску дуэт сваіх, айчынных, махляроў затрымалі. Тыя ўвогуле складаную схему прыдумалі. Знаёміліся ў інтэрнэце з адзінокімі жанчынамі постбальзакаўскага ўзросту. Адзін прадстаўляўся ўладальнікам будаўнічай фірмы, другі — нібыта арэндадаўцам аўтамабіляў. Дзейнічалі ў пары: пакуль адзін вёў чарговую даму сэрца на спатканне, другі ў гэты час незаўважна браў яе ключы ад кватэры, рабіў дублікат, а падчас наступнай яе сустрэчы з кавалерам залазіў у жытло і браў усё, што дрэнна ляжыць. Прычым дзейнічалі абсалютна ў духу Галахвастава з камедыі «За двума зайцамі» — не маючы нічога за душой, пускалі пыл у вочы. Адзенне для фота на сайтах знаёмстваў куплялі ў сэканд-хэндзе, машыны бралі напракат, здымалі на суткі кватэры, выдаючы за свае. Часам вазілі на дачу аднаго з іх, прычым «багаты» кавалер тлумачыў бедную абстаноўку лецішча так: маўляў, гэта дамок знаёмага, а свая амаль віла на рамонце. Частавалі паненак чарнілам, разлітым у бутэлькі ад дарагога віна, а «каньяк» рабілі самі са спірту і танных настоек. Увесь гэты танны кіч тлумачылі пасля следчым так: «Жанчынам падабаецца, калі прыгожа...»

ВЫНІК — як мінімум трое пацярпелых, а падазраецца не менш як дзесяць эпізодаў. Прычым у адной з кабет сперлі залатых вырабаў на 37 тысяч рублёў. Няўжо ўладальніца такіх дарагіх упрыгажэнняў (ці такой колькасці) не можа адрозніць калі не адзенне з буціка ад сэканд-хэнда, дык хоць бы дарагое віно ад намяшанага ў бутэльку ад яго бырла? Можа, мужчынкі былі настолькі абаяльныя, што на іншае ўвагі ўжо не звярталі? Дык жа не! Бачыла іх на фота з таго сайта — добра пацяганыя і зусім не Алены Дэлоны ў маладосці... Ці гэта праклятая адзінота так выпіла душу, што ўсе ўмоўнасці і падазрэнні ўбок, абы хоць каліва цяпла атрымаць? Бо бабін век — ён жа, кажуць, кароткі...

А яшчэ кажуць, што пры доўгіх валасах у нас кароткі і розум. Вось і думай, што з гэтага прычына, а што вынік.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

МІНСК.

19 мая 1956 года на імя Хрушчова паступіў дакумент, якому адразу прысвоілі грыф «Сакрэтна», хоць гэта быў праект выступлення Георгія Жукава на Пленуме ЦК КПСС, які павінен быў адбыцца. Але з чым была звязана такая канфідэнцыяльнасць, здавалася б, радавога даклада маршала, якіх на пленумах гучала нямала? Як сведчыць нядаўна рассакрэчаны тэкст, ён датычыўся аналізу памылак і пралікаў, дапушчаных у першыя гадзіны, дні вайны, і ніяк не ўпісваўся ў агульнапрынятыя ў СССР ацэнкі таго перыяду. Факты, якія там прыводзіліся, не проста непрыемныя — яны страшныя, асабліва тыя, што датычыліся сітуацыі ў Заходняй асобай ваеннай акрузе.

НЕБА ПАЧАРНЕЛА АД САМАЛЁТАЎ

У праекце выступлення гаварылася не толькі пра тое, што «...Узброеныя Сілы не былі своечасова прыведзены ў баявую гатоўнасць і да моманту ўдару саперніка ... ім не ставілася задача быць гатовымі адбіць удар, каб не справакаваць немцаў на вайну». Жукаў па хвілінах расказвае пра дзеянні кіраўніцтва 22 чэрвеня. «У 3 г. 15 хв. немцы пачалі баявыя дзеянні на ўсіх франтах. У 3 г. 25 хв. Сталін быў мною пабуджаны, і яму было даложана аб тым, што ў першы дзень вайны сітуацыя была некалькі іншая. Гучныя заявы кіраўніцтва краіны аб непераможнасці Чырвонай Арміі, аб тым, што «ваяваць будзем на чужой тэрыторыі», рабілі сваю справу. Горад жыў звыклым жыццём, і ўсе былі ўпэўнены, што ворага вось-вось адгоняць за межы граніцы. Аптымізму дадавала і паведамленне ТАСС, апублікаванае ў друку 14 чэрвеня 1941 г., г. зн. за тыдзень да нападзення фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. У ім гаварылася: «...па даных СССР, Германія таксама няўхільна выконвае ўмовы савецка-германскага пакта аб ненападзенні, як і Савецкі Саюз, з прычыны чаго, на думку немцы пачалі вайну. ...Мы з тав. С. К. Цімашэнкам прасілі дазволу даць войскам загад аб адпаведных дзеяннях у адказ. Сталін, цяжка дыхаючы ў тэлефонную трубку, на працягу некалькіх хвілін нічога не мог сказаць, а на паўторныя пытанні адказаў: «Гэта правакацыя нямецкіх ваенных. Агню не адкрываць, каб не развязаць больш шырокіх дзеянняў». Як сведчыць дакумент, дазволу на дзеянні ў адказ войскам не давалі практычна да 6.30 раніцы 22 чэрвеня. Цана — вялізныя чалавечыя ахвяры ў войсках, сярод мірнага насельніцтва. Толькі авіяцыя Заходняй асобай ваеннай акругі фактычна была знішчана ў першыя гадзіны вайны — з 1200 самалётаў 22 чэрвеня над Беларуссю страчана 738, немцамі было атакавана 26 аэрадромаў (у Прыбалтыцы — 11), у памежжы гарэлі беларускія гарады і вёскі. Але ў Мінску савецкіх колаў, чуткі аб намеры Германіі парваць пакт і распачаць нападзенне на СССР пазбаўлены ўсякай глебы».

Упэўненасць, што ўсё хутка скончыцца і немцаў далей прыгранічных раёнаў не прапусцяць, была настолькі вялікая, што жыхары горада працягвалі жыць у звыклым рытме. Шмат народу прыйшло на ўрачыстае адкрыццё Камсамольскага возера: штучны вадаём стаў падзеяй для 300-тысячнага горада. Хтосьці збіраўся ў Дом афіцэраў на спектакль МХАТ імя Горкага, што гастраліраваў тады ў Мінску. Працаваў транспарт, рынак, крамы. І нават выступленне па радыё ў 12 гадзін дня Вячаслава Молатава, намесніка старшыні Саўнаркама, пра тое, што пачалася вайна, не выклікала асаблівай занепакоенасці. Немцы 22 чэрвеня горад не бамбілі. Не выклікалі панікі і першыя бамбардзіроўкі ваколіц Мінска раніцай 23 чэрвеня. (Некалькі нямецкіх знішчальнікаў, якія прарваліся, ажыццявілі налёты на чыгуначную таварную станцыю і аэрадром.) Людзі працягвалі верыць, што гэта выпадковасць, што ўсё хутка скончыцца. Але драма разгулялася зусім хутка, 24 чэрвеня. Горад бамбілі ўжо раніцай 24 чэрвеня, а дакладней, першы налёт 47 нямецкіх самалётаў ажыццявілі ў 9.40. Затым былі яшчэ тры налёты, масіраваныя бамбардзіроўкі запальнымі, фугаснымі бомбамі. Вялізныя разбурэнні, практычна адразу знішчаны цэнтр горада, пачаліся пажары, перастаў хадзіць транспарт, зачыняліся крамы, шмат параненых, забітых. Як успаміналі відавочцы, пасля чарговай бамбардзіроўкі Мінска ад вуліцы Валадарскага засталіся адны руіны, руіны засталіся і ад бальніцы, якая там знаходзілася. І страшная карціна: зачапіўшыся за пераскрыццё трэцяга паверха разбуранага будынка, боўтаўся ложак, на якім на расцяжцы віселі загінулы пры налёце хворы. І такія карціны паўсюль, як і ні з чым не параўнальны пах пажарышча. Што датычыцца чыгуначных пуцей, то яны падвергліся бамбардзіроўцы ў першую чаргу і былі моцна разбураны, частка рухомага саставу знішчана, а Мінск працягвалі бамбіць і 24-га, і 25-га.

Аб бамбёжцы немцамі сталіцы сказана нямала, але незаслужана абыходзіцца ўвагай іншы факт. Разбурэнняў магло быць значна больш, калі б не супрацьдзеянне савецкай авіяцыі. Нягледзячы на велізарныя страты, за Мінск біліся адчайна. Экіпажы ўзляталі з аэрадрома Балбасава, што недалёка ад Оршы, дзе базіравалася 43-я знішчальная авіядывізія пад камандаванням генерал-маёра Георгія Захарава. Толькі адзін прыклад. Камдыў на сваім знішчальніку асабіста ацэньваў становішча над горадам. А яно было цяжкае. Гарэў не толькі Мінск, але і аэрадромы, на якіх знаходзілася незамаскіраваная тэхніка і самалёты. На гранічна нізкіх вышынях над горадам кружылі «юнкерсы», прыцэльна скідаючы бомбы на будынкі. Баі завязваліся прама над цэнтрам. Адзін такі паміж самалётам камдыва і чарговым «юнкерсам» адбыўся над дахам штаба Заходняй Асобай акругі. У выніку самалёт саперніка нахіліўся і ўпаў у раёне Оперната тэатра. Яшчэ адзін самалёт быў збіты над ускраінай горада. Сам жа камдыў садзіўся на пляцоўку ў Лошыцы, дзе таксама ўсё вакол гарэла. Рабілі, што маглі, каб адагнаць немцаў і мінімізаваць разбурэнні. Толькі лётчыкі аднаго 160-га палка дывізіі збілі больш за 20 нямецкіх самалётаў. «У небе было чорна ад фашысцкіх самалётаў, і якую б задачу мы ні ставілі лётчыкам, усё, па сутнасці, зводзілася да аднаго: збіваць! ...У тыя дні ні адной задачы — на штурмоўку, на прыкрыццё, на разведку — нельга было выканаць, не правёўшы паветранага бою. 24 чэрвеня 163-і полк збіў 21 варожы самалёт. Такую колькасць баявых машын нам не заўсёды ўдавалася збіваць нават усёй дывізіяй у другую палову вайны», — так пазней успамінаў генерал арміі Захараў.





Пратакол пасяджэння Бюро ЦК КП(б) Беларусі. 22.06.1941.

Нават немцы, якія ўвайшлі ў горад, не маглі стрымаць абурэння дзеяннямі свайго камандавання. Перад імі ўстала праблема не толькі размяшчэння, але і арганізацыі работы абслуговых арганізацый.

Пра тое, што кіраўніцтва рэспублікі ўжо пакінула сталіцу, жыхары даведаліся з чутак, якія распаўсюджваліся па горадзе. Для Мінска, куды ўжо ўваходзілі немцы, гэта была сапраўдная драма — многія ж маглі выратаваць.

ДАКУМЕНТЫ ПАД ГРЫФАМ «АСОБЫ СЕКТАР»

Можна толькі ўявіць, якой яшчэ драмай для Мінска маглі аказацца налёты нямецкай авіяцыі, калі б ім не супрацьстаялі савецкія асы. Кіраўніцтва рэспублікі знаходзілася ў Мінску, і, нягледзячы на тое, што Панцеляймон Панамарэнка, першы сакратар ЦК ВКП(б) Беларусі, быў членам ваеннага савета акругі і ведаў, што пачалася вайна, ужо з першых хвілін не пераставала верыць, што ўсё хутка скончыцца. Пастаянныя званкі, указанні з Крамля не паддавацца паніцы, не паддавацца на правакацыі таксама рабілі сваю справу. Пра тое, як дзейнічала беларускае кіраўніцтва, існуе нямала супярэчлівых даных. Нехта абяляе, хтосьці вінаваціць яго ва ўцёках. Ісціна, як заўсёды, пасярэдзіне. А адказ — у дакументах, многія з якіх доўгія гады захоўваліся пад грыфам «Асобы сектар» — найвышэйшай ступені сакрэтнасці. Яны сведчаць, што элементы ўсіх гэтых з'яў прысутнічалі: быў і гераізм, і жаданне змяніць сітуацыю, як і дзеянні, якія не паддаюцца логіцы, маральным ацэнкам. Але факт застаецца фактам: у поўнамаштабную вайну ў першыя гадзіны і нават дні сапраўды верылася з цяжкасцю, таму ўсе дзеянні беларускага кіраўніцтва былі накіраваны не на эвакуацыю, а на аднаўленне Мінска пасля бамбёжак, забеспячэнне нармальнага функцыянавання горада: сувязь, водазабеспячэнне, работа прадпрыемстваў.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4, вопіс 33 а, справа 4. Тут захоўваецца рассакрэчаны «Дзённік работы ЦК КП(б) Беларусі». Пачата 22 чэрвеня 1941 года, скончана 19 жніўня 1941 года». У ім літаральна па гадзінах распісаны ўсе зробленыя беларускім кіраўніцтвам крокі. Фактычна да дзвюх гадзін ночы 25 чэрвеня, да таго часу, пакуль улада заставалася ў Мінску, акцэнт рабіўся на аднаўленчыя работы. Пункт 1 запісу ад 24 чэрвеня 1941 года абвяшчаў: «Прыняты меры па ліквідацыі наступстваў бамбардзіроўкі, адноўлены тэл. сувязь, водаправод у гор. Мінску». З 22 да 25 чэрвеня ажыццяўлялася эвакуацыя сакрэтных архіваў, дакументаў ЦК партыі і камсамола, дзяржбанка з усімі каштоўнасцямі і архівам, дзіцячых устаноў». Толькі 23 чэрвеня дадзены ўказанні аб падрыхтоўцы да эвакуацыі наркаматаў, прадпрыемстваў, абсталявання, трактароў, жывёлы. Часткова эвакуацыя пачалася ўжо 22 чэрвеня, але масавай яшчэ не было, ды і падрыхтаваць да адпраўкі абсталяванне толькі 332 прамысловых прадпрыемстваў за дзень — два нават у стабільны мірны час — задача архіскладаная, а гаворка ішла пра нявызначанасць сітуацыі: 24 чэрвеня ўсё яшчэ даваліся ўказанні «па падтрымаці парадку ў гор. Мінску пасля бамбардзіроўкі».

Эвакуацыя ў Мінску і эвакуацыя ў іншых гарадах — гэта зусім не раўназначныя працэсы. У іншых гарадах

1941

яна праходзіла кардынальна ў іншых умовах, калі гэта з'яўлялася першачарговай задачай, калі сумненняў, што пачалася поўнамаштабная вайна, ні ў кога ўжо не было. Найбольш арганізавана і планамерна праводзілася эвакуацыя прадпрыемстваў і насельніцтва з Палескай і Гомельскай абласцей, якія былі пазней за іншыя акупіраваны нямецка-фашысцкімі войскамі. У Мінску ж усе намаганні зноў кінуты на аднаўленне сталіцы, вяртанне да нармальнага функцыянавання ўсіх сістэм жыццядзейнасці.

Варта адзначыць, што ў дзённіку пазначаны толькі час і пытанні, якія вырашаліся ў першыя гадзіны, дні вайны. Увесь драматызм сітуацыі — у матэрыялах ЦК КП(б)Б, аб'яднаных у Пратакол № 69, якія дайшлі да нас. Сапраўды ўнікальныя дакументы. Яны захоўваюцца таксама пад грыфам «Асобы сектар», і ў іх рашэнні бюро ЦК КП(б)Б за 22.VI—6. VIII 1941 г. (НАРБ. Ф. 4П. Оп. 3. Д. 1214. Л. 1—252). Перагортваючы старонку за старонкай, можна прасачыць паслядоўнасць дзеянняў беларускага партыйнага кіраўніцтва. Першае пасяджэнне 22 чэрвеня 1941 года. На ім прысутнічаюць члены бюро ЦК КП(б)Б Панамарэнка, Калінін, Былінскі, Ванееў, Цанава, Наталевіч, Эйдзінаў, Крупеня.

Першае пытанне — «Аб нападзенні Германіі на СССР». Прапанаваныя экстранныя меры пакуль яшчэ ў духу інструкцый: «Даручыць членам бюро ЦК і сакратарыяту неадкладна звязацца і падтрымліваць няспынную сувязь з абласцямі і раёнамі, у першую чаргу з абласцямі і раёнамі паласы распачатых ваенных дзеянняў. Перадаць указанні ЦК КП(б)Б: аб неадкладнай перабудове работы партарганізацый на ваенныя рэйкі; устанавіць сувязь з вайсковымі часцямі; аб арганізацыі ў гарадах і раёнах баявой СПА». І далей — «узмацненне аховы прамысловых прадпрыемстваў, чыгуначных вузлоў, транспарту, складоў, сродкаў сувязі, барацьба з авіядэсантамі сіламі створаных груп з ліку камуністаў, рабочых і сялян».

А яшчэ абавязковы комплекс ідэалагічных мер — «шырока папулярызаваць прамову тав. Молатава ў народзе, мабілізуючы ўвесь беларускі народ на барацьбу і разгром нямецкага фашызму, склікаць у Мінску і іншых гарадах партыйныя актывы для мабілізацыі на рашэнне задач, якія вынікаюць з ваеннай абстаноўкі, на ўсіх прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, установах правесці мітынгі». Тут жа адпаведныя даручэнні рэдакцыям газет «Советская Белоруссия» і «Звязда». Аддзелу прапаганды і агітацыі даручалася «да 12-й гадзіны ночы вырабіць лістоўкі, плакаты са зваротамі і лозунгамі да насельніцтва Беларусі». У прынятых рашэннях, у прапановах членаў ЦК — трывога, заклапочанасць, але ні ў кога пакуль няма сумнення, што ўсё пад кантролем арміі, таму ўсе дзеянні кіраўніцтва ажыццяўляюцца згодна з інструкцыямі на выпадак ваенных дзеянняў.

Пра тое, як дзейнічала беларускае кіраўніцтва, існуе нямала супярэчлівых даных. Нехта абяляе, хтосьці вінаваціць яго ва ўцёках. Ісціна, як заўсёды, пасярэдзіне.

НЕ ДА ЛОЗУНГАЎ І ЗАКЛІКАЎ

Але, мяркуючы па тым, як хутка мяняецца рыторыка пасяджэнняў бюро ЦК, па тых рашэннях, якія прымаюцца на наступны дзень, кіраўніцтву станавілася зразумела, што ўжо не да лозунгаў і заклікаў, а тым больш не да мітынгаў і партактываў — вораг імкліва наступае. Пратакол ад 23 чэрвеня 1941 года ставіць канкрэтныя задачы — аб эвакуацыі дзяцей, каштоўнасцяў і грашовых знакаў Дзяржаўнага банка БССР, аб кантролі за работай усіх відаў транспарту, прамысловых прадпрыемстваў. З пратаколаў відаць, што сітуацыяй кіруюць. Але, мяркуючы па колькасці прынятых у дадатак да асноўнага парадку непапулярных рашэнняў, у Мінску пачыналася спачатку блытаніна, а затым і паніка. У горад прыбываюць часці Чырвонай Арміі, якія адступаюць, шпіталі з прыфрантавой паласы, шмат параненых. Насельніцтва ўсё гэта бачыць, разумее неадпаведнасць рэальнасці лозунгам і заклікам не паддавацца паніцы. Але і дакладнай інфармацыі няма. І на гэтым фоне — узмацненне рэпрэсіўных мер.

Той жа пратакол ад 23 чэрвеня, ліст 5, пункт 9. «Аб арганізацыі ўзброеных рабочых атрадаў для ўзмацнення аховы прадпрыемстваў і парадку ў горадзе». Пастанавілі: «1. У мэтах узмацнення аховы прадпрыемстваў і парадку ў горадзе абавязаць Мінскі абкам і гаркам КП(б)Б стварыць па раёнах атрады ўзброеных рабочых і працоўных. 2. Прасіць Ваенны Савет Заходняга фронту вылучыць для гэтай мэты 5.000 вінтовак і адпаведную колькасць патронаў».

І зброя страляла, у першую чаргу ў тых, хто спрабаваў рабаваць крамы, фабрыкі, заводы — за марадзёрства, па законах ваеннага часу. Не разбіраліся і са зняволенымі, якія знаходзіліся ў следчых ізалятарах, многія па неабгрунтаваных даносах. Пункт 11 усё таго ж пратакола «Аб зняволеных, якія ўтрымліваюцца ў турмах Заходніх абласцей, асуджаных да ВМП (вышэйшай меры пакарання)». Яго фармулёўка не давала ім ніякага шанцу. Пастанавілі: «Даручыць тт. Цанаве і Мацвееву перадаць дырэктыву пра выкананне прыгавораў у дачыненні да асуджаных да ВМП, якія ўтрымліваюцца ў турмах Заходніх абласцей БССР» (Л. 5). Дакументы сведчаць, што людзей расстралялі, выканаўшы ў дакладнасці дырэктыву, і не толькі датычна заходніх абласцей, дзе ўжо былі немцы, яе выкарысталі і ў дачыненні да іншых турмаў рэспублікі. Лічбы назваць складана. Усё рабілася прыхапкам, немец наступаў, а даручэнне нельга было не выканаць. Гэта асобная драма першых дзён вайны, прадмет асаблівага вывучэння.

Гучныя заявы кіраўніцтва краіны аб непераможнасці Чырвонай Арміі, аб тым, што «ваяваць будзем на чужой тэрыторыі», рабілі сваю справу. Горад жыў звыклым жыццём, і ўсе былі ўпэўнены, што ворага вось-вось адгоняць.

Інакш чым драмай нельга назваць яшчэ адно рашэнне бюро ЦК. Сітуацыя відавочная, сталіцу немцы ўжо не толькі бамбяць — яны вось-вось увойдуць у горад. Рэпрэсіўныя рашэнні толькі ўзмацняюцца. Фонд 4п, вопіс 3, справа 1214, ліст 10: «Слухалі: Аб мерах стрымання панікі і арганізацыі інфармавання насельніцтва (Пастанова СНК БССР і ЦК КПБ(б)Б)». Чытаем: «Варожыя савецкай уладзе і нашаму народу элементы, агенты фашызму, у імкненні пасеяць разгубленасць і выклікаць паніку ў насельніцтва нашых гарадоў і вёсак распаўсюджваюць усякага роду правакацыйныя чуткі, хлусню і небыліцы. У мэтах спынення падрыўной дзейнасці ворагаў савецкага народа Савет Народных Камісараў Беларускай ССР і Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі пастанаўляюць: 1. Абавязаць пракурора Беларускай ССР т. Ветрава, абласных і раённых пракуроў неадкладна арыштоўваць і аддаць пад суд Ваеннага Трыбунала асоб, якія распаўсюджваюць розныя чуткі. 2. Асоб, якія самавольна пакінулі свае пасады (далей ідуць канкрэтныя прозвішчы): арыштаваць і аддаць пад суд Ваеннага Трыбунала як баязліўцаў і дэзерціраў».

І людзі заставаліся на сваіх працоўных месцах да апошняга, а яго ўсё не было і не было. 25 чэрвеня кіраўніцтва рэспублікі пакідае Мінск, прычым не робіць гэта тайна, не баяцца, ратуючыся ўцёкамі, як гэта растлумачвана ў шэрагу публікацый, а па ўказанні Ваеннага Савета фронту пераязджае ў Магілёў. Пра гэта — адпаведнае рашэнне таго ж Ваеннага Савета і апошні запіс у Дзённіку ЦК, зроблены 25 чэрвеня ў 1.45. Тое, што пра гэта забыліся паведаміць насельніцтву, знаходзіцца ў плоскасці не толькі маральна-этычных катэгорый, але і адказнасці за лёс тых, хто заставаўся ў горадзе і ўсё яшчэ працягваў выконваць рашэнні партыі, якія ніхто так і не адмяніў.

Пра тое, што кіраўніцтва рэспублікі ўжо пакінула сталіцу, жыхары даведаліся з чутак, якія распаўсюджваліся па горадзе. Для Мінска, куды ўжо ўваходзілі немцы, гэта была сапраўдная драма — многія ж маглі выратавацца. Пры гэтым у апошнім пратаколе пасяджэння бюро ЦК у Мінску ёсць яшчэ адзін пункт, у ім даручэнне чыгункі з прычыны эвакуацыі: «Абавязаць начальнікаў чыгунак тт. Гарныка, Краснабаева, Бурыкіна, Бадунова прадстаўляць неабходную колькасць вагонаў, у першую чаргу для членаў сем'яў начсаставу». Але і яны ўжо не змаглі скарыстацца гэтым запісам, многія так і засталіся ў горадзе, выбрацца з якога было практычна немагчыма. Пажарам быў ахоплены Барысаўскі, Даўгінаўскі тракт. Тыя, каму ўдалося выйсці з горада, вымушаны былі вярнуцца — вакол ужо былі немцы...

НЕПАПРАЎНЫЯ СТРАТЫ, КАЛАСАЛЬНАЯ ШКОДА

Вынік — амаль 85 працэнтаў пабудоў у горадзе было знішчана ў першыя дні вайны, моцна пацярпеў жылы фонд. Пасля дзяржкамісія па ацэнцы нанесенай шкоды ацаніла яго ў 70 працэнтаў. Акрамя чыгуначнага вузла, у Мінску было знішчана 45 кіламетраў трамвайных шляхоў, а гарадскі транспарт спынены цалкам. І самае страшнае — выведзены са строю каналізацыя і водаправод, узарваны рэзервуары і напорныя вежы. Пагроза эпідэміі станавілася рэальнасцю. Нават немцы, якія ўвайшлі ў горад, не маглі стрымаць абурэння дзеяннямі свайго камандавання. Перад імі паўстала праблема не толькі размяшчэння, але і арганізацыі работы абслуговых арганізацый, прадпрыемстваў, якія таксама моцна пацярпелі ад бамбёжак. Мінскі дрэваапрацоўчы імя Молатава, маторарамонтны, аўтазборачны, кіслародны заводы... Страты непапраўныя. Для размяшчэння немцы выкарыстоўвалі ўсё, што можна было прыстасаваць. Так, трансфарматарныя кабіны цягавай падстанцыі № 1 выкарыстоўвалі для конскіх стойлаў, машынную залу — пад казармы. Немцам прыйшлося нямала папрацаваць, каб хоць неяк наладзіць жыццядзейнасць горада: трэба было элементарна карміць, абслугоўваць войска. У першыя дні акупацыі пачалося разрабаванне і нацыянальных каштоўнасцяў рэспублікі: з Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР знікла, як потым было ўстаноўлена дзяржкамісіяй, амаль 1700 твораў жывапісу, сярод якіх палотны Айвазоўскага, Левітана, Сурыкава, Мікеланджэла, Растрэлі, абразы, скульптуры. З фондаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна з 2 мільёнаў тамоў прапала 1,5, сярод якіх унікальныя старадрукі. Шкода каласальная. А ў горадзе заставаліся людзі, якім трэба было перажыць страшныя гады вайны, калі баі над сталіцай працягваліся практычна ўвесь перыяд да вызвалення 3 ліпеня 1944-га. Як удалося выстаяць і адрадзіць разбураны Мінск, нягледзячы на прапановы пачаць яго будаўніцтва на новым месцы, бо аднаўляць ужо практычна не было чаго, гэта асаблівая старонка гісторыі.

Тады ж, у першыя дні вайны, асабістую драму, мяркуючы па дакументах, перажываў і Сталін. У цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расіі захаваўся арыгінал Першай зводкі Галоўнага камандавання Чырвонай Арміі, апублікаванай 23 чэрвеня 1941 года. Над тэкстам ён працаваў асабіста. Рукой Сталіна зроблены кароткія, лаканічныя праўкі, словы старанна падбіраюцца, па ўсім відаць, што ён вельмі хацеў супакоіць краіну. З гэтай прычыны зроблена ўстаўка: «Сапернік адбіты», але яна выкраслена. Сталін разумеў, што адбылося нешта страшнае. Упершыню за шмат гадоў на карту пастаўлены лёс СССР.

Урад з 25 чэрвеня працаваў ужо ў Магілёве. І гэта — іншыя рашэнні, пра што сведчаць матэрыялы пратакола № 69. У іх рэальная занепакоенасць пра лёс народнай гаспадаркі рэспублікі: жорсткія пастановы аб эвакуацыі прадпрыемстваў, навуковых, навучальных устаноў, сельгастэхнікі, жывёлы ў тыл краіны. У Магілёве зацвярджаюцца ключавыя дырэктывы «Аб пераходзе на падпольную работу партыйных арганізацый раёнаў, занятых ворагам», «Аб разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага», «Аб стварэнні спецыяльных атрадаў знішчальнікаў танкаў», «Аб арганізацыі атрадаў народнага апалчэння», прымаюцца іншыя найважнейшыя дакументы. Гэта ўжо былі тыя рашэнні, калі стала ясна: пачалася поўнамаштабная вайна.

Наталля ГОЛУБЕВА,
кандыдат гістарычных навук.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с 19**

Предмет аукциона

Лот, №	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %
